Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 252 (5085)
ЛІСТАПАДА
11
НЯДЗЕЛЯ
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

## НАРАДА САКРАТАРОЎ РК І НАЧПАЛІТАДДЗЕЛАЎ

Учора адбылася аднадзённая нарада сакратароў РК і начпалітаддзелаў, скліканая ЦК КП(б)Б. З дакладам аб задачах партарганізацыі і палітаддзелаў у чарговых гаспадарча-палітычных кампаніях выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Д. І. Валковіч.** У разгарнуўшыхся па дакладу спрэчках прынялі ўдзел загадчыкі аддзеламі ЦК, сакратары РК, нач. палітаддзелаў і іншыя таварышы.

У канцы нарады з вялікай прамовай выступіў сакратар ЦК тав. **Н. Ф. Гікало.**

## ЗА ПІЛЬНУЮ АХОВУ КАЛГАСНАЙ УЛАСНАСЦІ

**Агульнавядомы вялізарнейшы поспехі ў справе сацыялістычнай перабудовы нашай вёскі. Вынік сельска-гаспадарчых работ паказаў гігантскі ўзрошшую арганізаванасць калгаснай Беларусі. Рэзка павышаецца ў гэтым годзе кошт працадня. Магутны калгасны прыліў, небывалы з 1930 года, ярка сведчыць аб новых, вялікіх перамогах калгаснага ладу. Але было-б злачынствам самасупакоіцца на гэтых поспехах, не бачыць падрыўной работы класавага ворага ў калгасах, не бачыць тут элементаў класавай барацьбы.**

**Наш геніяльны праведыр — таварыш Сталін з выключнай глыбінёй даў аналіз новых форм і метадаў барацьбы астаткаў кулацтва і іншых эксплааататарскіх класаў. Будучы вышыбленымі з калгаса, гэтыя былыя людзі распаўзліся ўсюды «галоўным чынам па калгасах і соўгасах. Распаўзліся і ўкрыліся яны там, накінуўшы маску «рабочых і сялян», прычым сёй-той з іх прапез нават у партыю... ГАЛОЎНАЕ ў «дзейнасці» гэтых былых людзей заключаецца ў тым, ШТО ЯНЫ АРГАНІЗУЮЦЬ МАСАВАЕ ЗЛАДЗЕЙСТВА І РАСКРАДВАННЕ дзяржаўнай маемасці, кааператыўнай маемасці, калгаснай упаснасці. Злодзейства і раскрадванне... АСАБЛІВА ЗЛАДЗЕЙСТВА І РАСКРАДВАННЕ Ў СОЎГАСАХ І КАЛГАСАХ — ТАКАВА АСНОЎНАЯ ФОРМА «ДЗЕЙНАСЦІ» ГЭТЫХ БЫЛЫХ ЛЮДЗЕЙ». «Многія нашы таварышы, — гаварыў тав. Сталін, — БЛАГАДУШНА ГЛЯДЗЯЦЬ на падобнае з'явішча, НЕ РАЗУМЕЮЧЫ СЭНСУ І ЗНАЧЭННЯ ФАКТАЎ МАСАВАГА ЗЛАДЗЕЙСТВА І РАСКРАДВАННЯ. ЯНЫ ЯК СЛЯПЫЯ ПРАХОДЗЯЦЬ МІМА ГЭТЫХ ФАКТАЎ, ЛІЧАЧЫ, ШТО «ТУТ НЯМА НІЧОГА АСАБЛІВАГА». Але яны, гэтыя таварышы, глыбока памыляюцца... Дапускаць злодзейства і раскрадванне грамадскай упаснасці... І ПРАХОДЗІЦЬ МІМА ПАДОБНЫХ КОНТРРЭВОЛЮЦЫЙНЫХ АГІДНАСЦЕЙ — ЗНАЧЫЦЬ САДЗЕЙНІЧАЦЬ ПАДРЫВУ СОВЕЦКАГА ЛАДУ, ЯКІ АПІРАЕЦЦА НА ГРАМАДСКУЮ ЎЛАСНАСЦЬ, ЯК НА СВАЮ БАЗУ. З ГЭТАГА ВЫХОДЗІЎ НАШ СОВЕЦКІ ЎРАД, КАЛІ ЁН ВЫДАЎ НЯДАЎНА ЗАКОН АБ АХОВЕ ГРАМАДСКАЙ УЛАСНАСЦІ. ГЭТЫ ЗАКОН ЁСЦЬ АСНОВА РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЦІ Ў ДАНЫ МОМАНТ. А АБАВЯЗАК НАЙСТРАЖЭЙШАГА ЯГО ПРАВЯДЗЕННЯ Ў ЖЫЦЦЁ З'ЯЎЛЯЕЦЦА НАЙПЕРШЫМ АБАВЯЗКАМ КОЖНАГА КОМУНІСТА, КОЖНАГА РАБОЧАГА І КАЛГАСНІКА». (Падкрэслена намі. — Рэд. Сталін, «Три речи», стар. 104-109).**

**Трэба прама сказаць, што гэтых мудрых указанняў правадыра яшчэ ў цэлым радзе нашых раённых і калгасных партарганізацый далёка не зразумелі. Аб гэтым гавораць ПІСЬМЫ СЕЛЬКОРАЎ, якія мы сёння змяшчаем. Аб чым пішуць селькоры? Яны прыводзяць шматлікія факты раскрадвання калгаснай упаснасці, калгасных сродкаў. Метады раскрадвання рознастайныя — у адных калгасах раскрадваюцца фінансавыя сродкі, у другіх раскрадваюць калгасны хлеб, бульбу, жывёлу, яблыні і т. д. У адных калгасах гэта раскрадванне адбываецца адкрыта, у другіх скрыта — ці то ў часе адвозкі калгасных прадуктаў на рынак, ці то ў часе перавозкі іх з поля ў свірны, ці ў такой ускоснай форме, як напрыклад, абмен дрэннай каровы на добрую калгасную.**

**Варта толькі ўважліва прыглядзецца да гэтых фактаў раскрадвання калгаснай упаснасці, як мы зачастую ўбачым РУКУ КЛАСАВАГА ВОРАГА. Дачка гарадавога, сваяк памешчыка, кулакі, цвёрдазаданнікі — вось сапраўдныя арганізатары гэтых раскрадванняў. З пісем селькораў відаць, што ў адных выпадках яны НЕПАСРЭДНА арганізуюць гэта злодзейства, у другіх — стаяць у баку, дзейнічаючы праз сваіх агентаў. Пісьмы селькораў ускрываюць і другі надзвычай важны палітычны факт: [illegible] дзе адбываецца злодзейства і раскрадванне, там, як правіла, у наяўнасці зацісК калгаснай самакрытыкі, там выганяюць або прабуюць выгнаць з калгаса актыўных барацьбітоў са злодзействам, там падчас пагражаюць апошнім. Раскрадванне калгаснай упаснасці і сродкаў становіцца магчымым таму, што Ў ЦЭЛЫМ РАДЗЕ КАЛГАСАЎ НА ПАСТЫ СТАРШЫНЬ КАЛГАСАЎ, КЛАДАЎШЧЫКОЎ, РАХУНКАВОДАЎ ПРАНІК КЛАСАВЫ ВОРАГ АБО ЯГО АГЕНТУРА.**

**Ставіцца натуральнае пытанне: чаму-ж зараз, у 1934 г., магчымы такія факты? «Калі НАШЫ ТАВАРЫШЫ НЕ ЎЗБРОЯЦЦА РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ПІЛЬНАСЦЮ І НЕ ВЫГОНЯЦЬ З ПРАКТЫКІ АБЫВАЦЕЛЬСКА-БЛАГАДУШНЫХ АДНОСІН ДА ФАКТАЎ ЗЛАДЗЕЙСТВА І РАСКРАДВАННЯ ГРАМАДСКАЙ УЛАСНАСЦІ, ТО БЫЛЫЯ ЛЮДЗІ МОГУЦЬ НАРАБІЦЬ НЯМАЛА ПАКАСЦЕЙ». (Сталін, Падкрэслена намі).**

**Пісьмы селькораў наглядна пацвярджаюць словы правадыра. Хіба папітаддзел Сенненскай МТС і рэдакцыя райгазеты «Комунар» не былі інфармаваны селькорам аб фактах злодзейства з боку старшыні калгаса «Рудніца» Раткевіча? Хіба ў Лёзненскую МТС не пісаў селькор аб тым, што старшыня калгаса «Чырвоны земляроб» Керувімаў бярэ хлеб без вагі? Хіба ў Менскае гарза не паведамлялі, што старшыня калгаса «Чырвоны ўдарнік» Воўк Васіль спекулюе калгасным дабром? Колькі заяў ёсць у райкомах, райвыканкомах, у пракуратурах і міліцыях раду раёнаў аб злодзействе, раскрадванні калгаснага дабра? Чаму-ж пісьмы селькораў (не гаворачы ўжо аб вусных сігналах) па раду раёнаў (асабліва тут трэба адзначыць Пухавічы, Парычы, Клічаў, Лёзну, Сянно, Быхаў і т. п.), застаюцца без увагі? Тэму, што з практыкі не выгнан «абывательска-благадушны» настрой да злодзейства і раскрадвання; таму, што раённыя работнікі, як «сляпыя праходзяць міма гэтых фактаў, мяркуючы, што «тут няма нічога асабліва». ПРЫТУПЛЕННЕ КЛАСАВАЙ пільнасці, асабліва ў некаторых ПРАКУРОРСКІХ і МІЛІЦЭЙСКІХ апаратах стварае магчымасць былым людзям беспакарана арганізоўваць злодзейства і раскрадванне ў калгасах. БЮРАКРАТЫЧНА - КАНЦЫЛЯРСКІЯ МЕТАДЫ КІРАЎНІЦТВА калгасамі абліччаюць класаваму ворагу яго падрыўную работу. Там, дзе няма КАНКРЭТНАГА кіраўніцтва КОЖНЫМ калгасам, яго ЭКАНОМІКАЙ, ФІНАНСАМІ; там, дзе прыходзяць у цяпячае захапленне ад факта, што калгас выканаў, скажам, план хлебапаставак і не цікавяцца лёсам АСТАЎШАГАСЯ ў калгасе хлеба, — там часцей за ўсё выяўляюцца факты кулацкай падрыўной работы.**

**Пісьмы селькораў з усёй вострасцю ўскрываюць той факт, што растраты і пакражы з'яўляюцца СУР'ЁЗНАЙ ЗБРОЯЙ БАРАЦЬБЫ КЛАСАВАГА ВОРАГА З КАЛГАСНЫМ ЛАДАМ. Ці можна здзіўляцца таму, што растраты і раскрадванне калгаснай маемасці ўносяць дэмаралізацыю ў рады калгаснікаў гэтых калгасаў; што няўвага да сігналаў калгаснікаў штурхае іх у асобных выпадках на шлях уходу з гэтых калгасаў; што гэтыя дзеянні класавага ворага тармозяць прыліў у калгасы. НЕ ПЕРАСЕКШЫ ЖАЛЕЗНАЙ РУКОЙ ГЭТЫХ РАСТРАТ І ПАКРАЖ, НЕЛЬГА ЎМАЦАВАЦЬ ГЭТЫХ КАЛГАСАЎ НІ ГАСПАДАРЧА, НІ ПАЛІТЫЧНА. Трэба пакласці канец абывательска-благадушным, ліберальным адносінам да злодзейскай работы класавага ворага і яго агентуры. Баявая задача партыйных, совецкіх, асабліва пракурорскіх і міліцэйскіх работнікаў, — цвёрдай рукой правесці ў жыццё ўказанні правадыра, што «барацьба за ахову грамадскай упаснасці, БАРАЦЬБА ЎСІМІ МЕРАМІ І ЎСІМІ СРОДКАМІ, ПРАДАСТАЎЛЕНЫМІ Ў НАША РАСПАРАДЖЭННЕ ЗАКОНАМІ СОВЕЦКАЙ УЛАДЫ, з'яўляецца адной з асноўных задач партыі» (Сталін).**

**Ні адзін сігнал аб раскрадванні калгасных сродкаў ці маемасці не павінен астацца нерасследаваным. Ні адзін вінаваты ў гэтым раскрадванні не павінен астацца не прыцягнутым да адказнасці. НЕ МОЖА ЬЫЦЬ ЛІТАСЦІ РАСКРАДВАЛЬНІКАМ КАЛГАСНАЙ ГРАМАДСКАЙ УЛАСНАСЦІ. Трэба пакончыць з такім становішчам, калі па раду калгасаў няма дакладнага ўліку хлеба, паступаючых грошай. Трэба раз назаўсёды ліквідаваць «сямейныя» непарадкі, пры якіх старшыня таго ці іншага калгаса месяцамі носіць тысячы ў кішэні, а ў калгаснай кнізе невядома, колькі запрыходавана і расходавана. Калгасныя грошы павінны быць у ашчадкасе, а пераходзячыя сумы павінны знаходзіцца ў касіра (слабанёнага ці неаспабанёнага, у залежнасці ад велічыні калгаса). РАЙЗА ПАВІНЕН СІСТЭМАТЫЧНА КАНТРАЛЯВАЦЬ ФІНАНСАВУЮ ГАСПАДАРКУ І ЎСЮ СПРАВУ ЎЛІКУ Ў КАЛГАСАХ. Трэба пакончыць з такімі парадкамі, калі па раду калгасаў старшыня яго па гаду не робіць справаздачы перад калгаснікамі. ТРЭБА ЎЗНЯЦЬ РОЛЮ І АДКАЗНАСЦЬ РЭВІЗІЙНЫХ КАМІСІЙ. Трэба ачысціць іх склад ад чужых элементаў. Трэба прыцягнуць да крымінальнай адказнасці тых кіраўнікоў калгасаў, якія праследуюць чэсных калгасных «рэвізораў». А ГАЛОЎНАЕ—трэба штодзённа памятаць словы правадыра: «РЭВОЛЮЦЫЙНАЯ ПІЛЬНАСЦЬ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ТОЙ САМАЙ ЯКАСЦЮ, ЯКАЯ АСАБЛІВА НЕАБХОДНА ЦЯПЕР БОЛЬШЭВІКАМ» (Сталін).**

# ВЫСТУПЛЕННЕ тав. КАЛІНІНА

### на ўрачыстым пасяджэнні Маскоўскага совета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў сумесна з цэнтральнымі маскоўскімі партыйнымі, профсаюзнымі і совецкімі арганізацыямі і рабочымі-ўдарнікамі, прысвечаным XVII гадавіне Окцябрскай рэволюцыі, 6 лістапада 1934 года

### I.

Таварышы, мы сёння святкуем XVII гадавіну совецкага ладу.

Як бачыце, праз год совецкі лад па нашых законах будзе мець поўнагоддзе (смех, апладысменты).

А колькі было прароцтваў, калі з вельмі вучоным відам «мудрацы» гаварылі, што не толькі да поўнагоддзя, а наш лад не перажыве і дзіцячага ўзросту. Не будзем прыдзіраліва да буржуазных ідэолагаў. Гісторыя ім пакінула адзін від літаратуры—гэта пісаць мемуары.

Я дазволю сабе не спыняцца на прынцыповым баку гэтага вялікага дня, гэтай вялікай для працоўных мас падзеі.

Вучэнне Леніна з кожным годам усё больш пранікае ў народныя гушчы, а гэта значыць, што і прынцыповае значэнне гэтага ладу становіцца ўсё больш зразумелым шырокім масам. Гэта робіцца тым больш зразумелым, што пры пасніховым будаўніцтве социялізма ў нашай краіне з кожным годам усё больш выяўляюцца нашы дасягненні, в ўляюцца становучыя бакі социялістычнага грамадства.

Я спынюся толькі на асаблівасцях мінуўшага года, на тых ступенях, на якія мы падняліся ў гэтым годзе.

Хоць вытворчы год яшчэ не скончыўся,—канчатковыя вынікі мы будзем падводзіць праз два месяцы, крыху менш двух месяцаў,—усё-ж у асноўным рэзультаты ўжо вызначыліся поўнасцю.

У папярэднім годзе наша асаблівая ўвага была аддана цяжкай прамысловасці. Не заграмаджаючы вас лішнімі лічбамі, усё-ж напомню, што асноўны прадукт металургіі—чыгун з 19,8 тыс. тон сярэдне-сутачнай здабычы ў 1933 г. і з 23,6 тысяч тон сярэдне-сутачнай выплаўкі ў студзені гэтага года вырас да 30,9 тысяч тон у кастрычніку. Ёсць поўная падстава дапускаць выкананне гадавога плана. А больш праўдападобна перавышэнне фактычнай выплаўкі ў гэтым годзе ў адносінах да плана.

Як бачыце, поспех немалы, ён яшчэ больш пацвярджаецца тым, што, не гледзячы на павелічэнне выплаўкі ў іншых краінах у параўнанні з мінулым годам, мы ўсё-ж спадаяемся заняць другое месца ў свеце па выплаўцы чыгуну, пакідаючы ззаду Англію, Германію і т. д.

Я гэтым ні ў якім разе не хачу пахваліцца, весці да заспакаення дасягнутымі рэзультатамі. Наадварот, мне хочацца гэтай ілюстрацыяй падбадзёрыць, падштурхнуць металургію, каб 1935 год пачаць выплаўкай чыгуну з 35 тысяч тон у суткі.

Паводле сцвярджэння металургаў, вытворчыя магчымасці для гэтага ў нас ёсць. Але мяне не асабліва задавальнае другое месца ў свеце на выплаўцы чыгуну. На-першае, вытворчыя магчымасці пераганяемых намі краін стаяць куды вышэй іх сучаснай вытворчасці, бо крызіс штучна зніжае іх вытворчасць, а затым занадта ўжо вялік разрыў паміж першым і другім месцам.

Даволі вам напомніць, што Амерыка ў 1929 годзе выплаўляла 125 тысяч тон чыгуну і 175 тысяч тон сталі. Як бачыце, разрыў паміж першым і другім месцам велізарны. Шлях у перадзе да першага месца яшчэ вельмі доўгі, а краіна наша,—я думаю, вы самі ў гэтым не сумняваецеся,—мае патрэбу ў метале, бадай, не менш, чым заволжскія стэпы ў вадзе.

Напэўна, значная колькасць чытакчых газеты заўважаюць, што ў зводках вытворчай здабычы металу ў нас на першым месцы стаіць чыгун, у той час як у краінах буйнай вытворчасці металаў на першым месцы ідзе сталь і на другім чыгун.

Лічбы Амерыкі вельмі наглядна паказваюць, што наша краіна яшчэ бедна металам. Ды гэта і натуральна: сярэдні сялянскі двор да рэволюцыі можна з упэўненасцю сказаць, меў у наяўнасці не больш двух-трох пудоў жалеза ва ўсім сельска-гаспадарчым інвентары. У сучасны момант адна машынатрактарная станцыя мае металу, я думаю, напэўна больш, чым ранейшы павет усіх сялянскіх гаспадарак. А ў гарадах? Масква служыць бліскучай ілюстрацыяй у гэтых адносінах: за апошнія два-тры гады колькі старой дрэні разбурана і вывезена на звалку, але ў гэтай дрэні менш за ўсё металу.

Вось чаму наша краіна, як губка ваду, убірае ў сябе метал. Толькі праз некалькі год, калі свабодныя поры будуць напоўнены металам, адваротная хваля на заводы пойдзе лом, і наша сталёвая прамысловасць перагоніць чыгунную. Ад работы металургаў залежыць паскорыць гэты час.

Я не спыняюся на асноўных спажыўцах металу. Патрэбнасць іх гігантскі расце—чыгуннае будаўніцтва, флот, машынабудаўніцтва і т. д. Гэта само сабой зразумела.

Вось калі з гэтага боку, з боку патрэбнасцей у метале, паглядзіш, то ўбачыш, што нашы дасягненні—толькі першыя крокі. Яны, вядома, найбольш трудныя, але непередзе яшчэ гігантская работа. У нас, таварышы, таксама значныя дасягненні ў галіне сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва, варштатабудаўніцтва і т. д. Усё гэта патрабуе вялікіх колькасцей металу.

Значная работа прароблена намі і ў іншых галінах цяжкай прамысловасці. Хімічная прамысловасць выходзіць на шырокую дарогу. Да камбінатаў Хібінагорскага, калійнага і іншых—далучан Сталінагорскі, не гаворачы ўжо аб радзе коксахімічных установак, з якіх кожная пасобку прадстаўляе велізарны хімічны завод, напрыклад Макеёўка.

З машынабудаўніцтва ўкажу, што да ўральскага завода буйнага машынабудаўніцтва дадан новы сабрат—Краматорскі.

Нельга абыйсці маўчаннем асваенне магутных паравозаў Луганскім паравозаа-будаўнічым заводам, а таксама асваення поўнай магутнасці Чэлябінскім трактарным заводам і тэкстыльнага машынабудаўніцтва, выканаўшага заказ Туркбуду. Наша машынабудаўніцтва выходзіць на міжнародную арэну. Не ведаю, якое ўражанне робіць гэта на вас, я-ж, як ні імкнуся трымацца ў межах скромнасці—мяне ўсё-ж захапляе пачуццё гордасці.

Я хачу адцяніць работу па каляровых металах. Яна пакуль яшчэ слаба, далёка ад выканання плана, у асаблівасці па медзі. Урад у гэтым годзе таксама звяртаў вельмі вялікую ўвагу на гэты слабы ўчастак, і ў мяне ёсць вялікая надзея на тое, што агульнымі сіламі і ў асаблівасці з дапамогай партыі ў будучым годзе і гэты ўчастак нашай работы выцягнем. Але было-б не справядліва не ўказаць і становучыя фактары ў галіне каляровай металургіі. Алюмінієвая прамысловасць працуе добра, нікелевая расце. Праведзены значныя разведкі і такіх дэфіцытных металаў як волава. Я, разумеецца, прыводжу толькі адзінва прыклады, але поспехі нашы ў гэтай галіне значныя. Напрыклад, залатая прамысловасць выконвае і нават перавыконвае свой план.

Некалькі слоў аб капітальным будаўніцтве. Яго размах вялікі. Каб мець некаторае нагляднае ўяўленне, даволі прывесці метрабуд у Маскве і Волга-Маскоўскі канал. Калі ідзе планавае размеркаванне матэрыялаў і масквічы ў імкненні атрымаць матэрыялаў больш матывуюць грандыёзнасцю даных работ, звычайна яны сустракаюць рэпліку тав. Орджанікідзе аб тым, што гэтыя работы ў нас не з'яўляюцца самымі грандыёзнымі. І сапраўды, узяць хоць-бы звышмагістраль Масква-Данбас. З гэтага простага супастаўлення можна зразумець велічыню капітальных пабудаванняў.

### II.

Лёгкая прамысловасць працуе ў значнай ступені непасрэдна на задаволенне патрэб насельніцтва. З гэтага боку яна мае асаблівае значэнне. У асноўным яе лімітам з'яўляецца сырэц: бавоўна, шоўк, шэрсць і т. д. Усё-ж у ёй яшчэ слабая работа і колькасна, і якасна, не гледзячы на тое, што мы ёй даем добрую бавоўну. Што датычыць штучнага шоўку, то ён у нас яшчэ не заняў таго сапраўднага месца, якое ён павінен быў-бы займаць. Шкло, фарфар, фаянс, запалкі—прадметы, якія не лімітуюцца з сырцом і якія патрабуюцца ў велізарнай колькасці, не задавальняюць попыту. А тым часам вырасшая культура ў быту—усё гэта патрабуе ў велізарных колькасцях, як у горадзе, так і ў вёсцы, бо ўсе гэтыя прадметы з'яўляюцца і прадметамі хатняга ўжытку, а таксама і прадметамі культуры. Асабліва мы слабы ў скарыстанні сурагатаў. Тут яшчэ непачаты край работы даследчых інстытутаў.

Укажу і на некаторыя поспехі і лёгкай прамысловасці. У нас значна вырасла вытворчасць трыкатажу, катаніну, выпуск ботаў даведзен да 57,8 млн. пар, выпуск гумовай падашвы з 1931 года павялічыўся ў 10 раз. Але ўсё гэта па сутнасці кап ля ў моры, усё гэта ёсць толькі пачатак размаху.

### III.

Чыгункі далі некаторы эрух, але яны ўсё-ж не выконваюць яшчэ планаў перавозкі, хоць у бягучым годзе перавезена грузаў больш супроць мінулага года.

За 9 месяцаў 1934 г. сярэдне-сутачная нагрузка вагонаў выразілася ў 55.307 супроць 50.473 вагонаў за такі-ж час 1933 года. Тым не менш план бягучага года выконваецца на 90,7 проц. Праўда, у вагавым выражэнні чыгункі ў бягучым годзе план выканалі. Яны нагрузілі 233.162 тыс. тон, планам было намечана нагрузіць 231.300 тысяч тон. Такім чынам, калі падыйсці к выкананню чыгункамі плана перавозак у тона-кілометрах, то атрымаецца перавыкананне: задание было ў 150.700 млн. тона-кілометраў на 9 месяцаў, а выканана за гэты час — 160.094 млн. тон, г. зн. на 106,2 проц.

Урад аддае вельмі вялікую ўвагу праблеме пад'ёму чыгуначнага транспарта. Як відаць, і надыходзячы год у гэтай галіне патрабуе вялікай работы. І не толькі ў галіне тэхнічнага паляпшэння і лепшай арганізацыі аператыўнай работы, але і такога планавання, якое-б з максімальнай прадукцыйнасцю скарыстала і іншыя віды транспарта, як напрыклад, водны. Перавозкі гігантскі растуць. Калі ўзяць толькі аўтрактарную прамысловасць, яе гатовую прадукцыю, то і для гэтага трэба вельмі многа транспарту. Ясна, што трактары і аўтамашыны неабходна перавозіць таксама і вадою, не гаворачы ўжо аб хлебе, гароднінне і т. д.

Сучаснае становішча трактаў і міжпасялішчных дарог далей становіцца нецярпімым. Месцы гэтаму павінны аддаваць выключную ўвагу, бо яны непрадукцыйна паглынаюць велізарную колькасць працы і цягавай сілы.

### IV.

У галіне сельскай гаспадаркі бягучы год пацвердзіў, паказаў, так сказаць у практычным жыцці, наколькі калектыўная гаспадарка вышэй і прадукцыйней супроць індывідуальнай гаспадаркі ў вырабе прадукцыі сельскай гаспадаркі.

Гэты вегетацыйны год быў у вышэйшай ступені капрызны. Вы ведаеце, што ўраджай ва ўсіх еўрапейскіх краінах у гэтым годзе куды ніжэй сярэдняга ў параўнанні з радам папярэдніх год. У нас вясной вельмі доўга не было дажджу ў паўднёвых раёнах, а ў стэпавай Украіне і ў асаблівасці ў Днепрапятроўскай і ва ўсходняй частцы Адэскай абласцях дажджоў было менш, чым у 1921 засушлівым годзе. Засухай ахапіла і частку Азова-Чорнаморскага края. Сяляне-калгаснікі правялі выключную энергію ў барацьбе з засухай.

Пры падтрыманні ўрада ўсе загінуўшыя плошчы перасяваліся позні мі культурамі. Амаль усюды захаваліся агародныя культуры. Такім чынам, ураджай гароднінны ў гэтых мясцах здавальняючы. Ён быў вырван у прыроды настойлівасцю калгаснікаў. Што характэрна, у людзей зусім адсутнічала паніка. Усе былі захоплены барацьбой за ўраджай. Гэтаму дапамагла і добрая папярэдняя апрацоўка.

Усё гэта разам узятае дало людзям магчымасць выскачыць параўнаўча ўдачна з вялікага няшчасця, якое магло быць у гэтых бедных асадкамі раёнах. Тут калгасы апраўдалі сябе поўнасцю.

Што дзіўна, дык гэта тое, што ў лепшых калгасах ураджай быў усё-ж сярэдні, а ў некаторых і вышэй сярэдняга. Гэта даказвае, наколькі ўраджай залежыць ад арганізаванасці і волі людзей. У астатняй частцы гэрыторыі Саюза ўраджай ва ўсякім выпадку не ніжэй сярэдняга, а на ўсходзе і ў Заходняй Сібіры выдатны.

Убоўка хлябоў у Саюзе адбывалася ў вогуле ў спрыяльных умовах, але ўсходнія раёны з вельмі добрым ураджаем мелі цэлы рад труднасцей. Неўласцівыя гэтым раёнам частыя дажджы, позняе пасяванне хлябоў, ранні снегапад — усё гэта патрабавала ад мясцовых улад павышанага кіраўніцтва, лепшай маневранасці, а ад калгасніка велізарнай напружанасці для таго, каб у кароткі тэрмін і з найменшымі стратамі ўбраць ураджай. Урад своечасова звярнуў асаблівую ўвагу на іх. На месцы была паслана значная колькасць адказных работнікаў. Мясцовыя органы як след устрахнуліся і ў канчатковым выніку з работай па ўборцы ўраджаю справіліся задавальняюча.

Падводзячы вынікі сельскагаспадарчага года, можна з поўнай упэўненасцю сказаць, што арганізаванасць, маневранасць, прадпрыімальліва і прадукцыйнасць калгасаў у цэлым выраслі ў параўнанні з мінулым годам. У адпаведнасці з гэтымі паказальнікамі вырас і ўраджай усіх прадуктаў вышэй леташняга. Практыка сёлетняга года вельмі наглядна паказвае, што добры ўраджай—справа рук калгасніка і кіраўніцтва калгасам.

Хлебапастаўкі сёлетняга года ў цэлым прайшлі арганізаваней, хутчэй і з меншымі стратамі сіл і прадукцыі, чым гэта было ва ўсіх папярэдніх гадах. Яны мелі тую асаблівасць, што на Украіне ў сувязі з дрэнным ураджаем у яе паўднёва-ўсходняй частцы быў дан зніжаны план значнай частны калгаснікаў. Належачыя з іх па закону пастаўкі хлеба адтэрмінаваны на будучы год, а таксама адтэрмінаваны і насенпазыкі.

Само сабой разумецца, што гэта зменшыла агульную суму хлебапаставак. Затое добры ўраджай у іншых частках Саюза значна павялічыў паступленне хлеба ад узмоцненай работы МТС, і ўрад разгарнуў праз кааперацыю вольную закупку хлеба, чым і перакрыт план сёлетняга і мінулага года.

Трэба ды сказаць, што кошт закупленага хлеба куды вышэй, бо пакупныя цэны вышэй на 20-40 процантаў. Вядома, і хлеб, атрыманы за работу МТС, прымаючы пад увагу ўсе расходы, якія нясе дзяржава на іх, таксама будзе даражэй.

Калі прааналізаваць усе аперацыі па загатоўках хлеба ў гэтым годзе, то нявольна ўспамінаеш словы т. Сталіна, сказаныя ім на адной з нарад: «у хлебазагатоўках дзяржавы з кожным годам будзе расці роля МТС і закупкі кааперацыі». Хлебазагатоўкі бягучага года пацвердзілі гэту думку поўнасцю. А гэта-ж значыць, што ў галіне хлебазагатовак гандаль так сама пачынае адыгрываць ўсё большую ролю, бо ўплата хлебам за работу МТС гэта таварышы, ёсць адна з выгадных продажаў хлеба калгасамі. Нядаўма попыт калгасаў на арганізацыю у іх МТС перавышае магчымасці яго задавалення. Відавочна, што і размеркаванне хлеба сярод спажыўцоў павінна змяніцца ў бок гандлю, у бок знішчэння картачнай сістэмы. Ва ўсякім выпадку жыццё ставіць цяпер гэта пытанне перад урадам на практычную глебу і патрабуе адпаведнага рашэння.

У гэтым годзе значна пасунуўся наперад дзяржаўны і кааператыўны гандаль. Знаходзячыся ў непасрэднай сувязі са спажыўцом, ён павінен стаць штурхачом у паляпшэнні якасці прадуктаў.

Я не хачу, таварышы, перад вамі развіваць у лічбовых выражэннях паступальнага развіцця ўсіх народаў Саюза ССР. Напомню толькі аб важнейшых падзеях, якія маюць для нас, для нашага народа вялікае значэнне. Палёты ў стратасферу, эпапея чэлюскінцаў, з'езд лётчыкаў, пераход «ЛІТКЕ» з Владівастока ў Мурманск, перамога нашых спартсменаў за межамі Саюза,—адно пералічэнне гэтых падзей, якія маюць месца ў гэтым годзе, паказвае рост культуры ў нашай краіне.

### V.

Работа нашай дыпламатыі ў гэтым годзе была інтэнсіўнай і напружанай. Нашы палітычныя, гандлёвыя і культурныя міжнародныя адносіны багаты падзеямі. Я пастараюся на іх толькі скупа спыніцца.

Намі заключан рад пактаў аб узаемным ненападзе як з нашымі суседзямі, так і з радам вялікіх дзяржаў. Метазгоднасць іх агульна-палітычнага значэння і карыснасць для бакоў не выклікае сумнення.

У гэтым годзе мы ўвайшлі ў Лігу нацый. Некаторыя зарубежныя палітыкі ў гэтым бачаць нашу непаслядоўнасць. Тав. Сталін прадбачыў гэты аргумент, калі ён гутарыў з карэспандэнтам амерыканскай газеты «Нью-Ёрк таймс» г. Дюранці яшчэ 25 снежня 1933 г. Вось што гаварыў тав. Сталін аб магчымым уваходжанні СССР у Лігу нацый «Не гледзячы на выхад Германіі і Японіі з Лігі нацый ці можа быць імена таму, Ліга можа стаць некаторым тормазам для таго, каб затрымаць узнікненне ваенных дзеянняў або перашкодзіць ім. Калі гэта так, калі Ліга зможа аказацца нейкім узгорачкам на шляху да таго, каб хоць бы некалькі затрудніць справу вайны і аблягчыць у некаторай ступені справу міру, то тагды мы не супроць Лігі. Так, калі такі будзе ход пістарычных падзей, то не выключана, што мы падтрымаем Лігу нацый, не гледзячы на яе каласальныя недахопы».

Гэта кароткая матывіроўка мае здаецца такой пераканаўчай, што цэлымі тамамі аргументаў яе не абвержеш, калі сапраўды даражыш мірам.

Што можна сказаць аб далёка-усходніх падзеях, якімі з зусім зразумелых прычын глыбока цікавіцца насельніцтва совецкай краіны? Непасрадна датычнае нас—гэта перагаворы аб продажы Кітайска-Усходняй чыгункі.

Ужо другі год па гэтаму поводу вядуцца перагаворы паміж урадам Саюза ССР і урадам Манчжоў-Го. У сучасны момант гэтыя перагаворы значна прасунуліся наперад. Я думаю, што гэта можна лічыць становучым фактам.

Таварышы, наўрад ці вядзе хоць адна краіна такую наслядоўную палітыку, як Саюз Совецкіх Социялістычных Рэспублік. Сутнасць гэтай палітыкі—барацьба за мір. Прачытайце ўсе выступленні совецкіх урадаўстаўнікоў на міжнародная арэне, прааналізуйце заключаныя совецкім урадам акты з другімі краінамі—у іх чырвонаю ніткаю праходзіць абарона міру. Трэба прызнацца, і мяне гэта вельмі здзіўляе, што грамадскае даўленне супроць вазуючых элементаў вельмі слабае. За межамі Саюза ССР ваенныя настроі пануюць не толькі ва ўрадавых сферах, але і на грамадскай арэне. Відавочна, што сярод шырокіх слаёў насельніцтва пачынаюць забывацца жахі вайны, чым хочуць скарыстацца ўласнікі акцый ваенных прадпрыемстваў.

Лискатанне зброяй ва многіх краінах стала лічыцца доблесцю, патрыятызмам патрыятызмам. Здавалася-б супроць гэтага павінен паўстаць увесь свет. Бо гэта-ж вядзе да найвялікшых няшчасцяў народаў і чаўлівы кучкі авантурыстаў. Прырода капіталістычнага ладу раскрывае ва ўсёй сваёй агаленасці. Народная бойня—крызіс, крызіс — народная бойня.

Наша дыпламатыя, выконваючы волю свайго ўрада і комуністычнай партыі, чэсна ў інтарэсах усіх працоўных працуе за захаванне і ўмацаванне міру. Рішэнне цёмных сілы гэтай самай жарыслай рабоце не здольны перашкодзіць або скрыць яе ад народаў.

Мы не ласкочам зброяй, хоць пройдзеная доўгая гісторыя нашай барацьбы і ўмовы сёння ня навучылі нас яе высока цаніць. Ніхто ні ў адной краіне не любіць так сваіх ваенных, як наш народ любіць сваю Чырвоную армію (апладысменты). Народ не памыляецца, бо яна з'яўляецца ў даны час апорам яго спакою і работы.

Таварышы, у нас пачаліся выбары ў мясцовыя советы і падрыхтоўка да VII з'езда советаў Саюза ССР. Пры самай скромнай прыдзірлівай ацэнцы за час з VI па VII з'езд советаў Саюза мы зрабілі многае і грунтоўна моцна заложав фундамент социялізма. Мы ствараем бясклассавае грамадства, мы праводзім у жыццё ідэі Леніна, ідэі яго партыі.

Адзінаццаты год рулявым партыі, правадыром усіх працоўных у гэтай вялікай бітве за рабочы клас стаіць тав. Сталін.

Пад яго кіраўніцтвам з максімальнымі палітычнымі результатамі пераадзем выбары у советы пойдзем да новых перамог. (Апладысменты, «Інтэрнацыянал»).

## БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ ЗЛЕТУ УДАРНІКАЎ АРШАНСКАГА ЭКСПЛААТАЦЫЙНАГА АДДЗЯЛЕННЯ

### ОРША, ПРЭЗІДЫУМУ УРАЧЫСТАГА СХОДА АКТЫВА ЧЫГУНАЧНІКАЎ

**ЦК КП(б)Б, адзначаючы ваш першы поспех, які выявіўся ў атрыманні пяршынства станцыяй Менск-таварная і Аршанскім аддзяленнем па МББ чыг., жадае ўдарн

# ПАД СЦЯГАМ ЛЕНІНА-СТАЛІНА—ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!

## З даклада тав. А. І. ХАЦКЕВІЧА на ўрачыстым пленуме Менскага гарадскога совета 6 лістапада 1934 года

17 год мінула з таго часу, калі пераможная Окцябрская социялістычная революция пад непасрэдным кіраўніцтвам Леніна і Сталіна скінула ўладу буржуазіі і ўстанавіла дыктатуру пролетарыята на тэрыторыі былой царскай Расіі.

Окцябрская революция з'явілася першым прарывам імперыялістычнага ланцуга ў яго найбольш слабым звяне. Окцябрская революция з'явілася пачаткам і сустаўной часткай сусветнай пролетарскай революциі.

Тав. Сталін, гаворачы аб сусветным значэнні Окцябрскай революциі, пісаў:

«Сусветнае значэнне Окцябрскай революциі заключаецца не толькі ў тым, што яна з'яўляецца вялікім пачынам адной краіны ў справе прарыву сістэмы імперыялізма і першым ачагом социялізма ў акіяне імперыялістычных краін, а таксама і ў тым, што яна складае першы этап сусветнай революциі і магутную базу яе далейшага разгортвання».

Окцябрская революция перш за ўсё пакончыла з нацыянальным уціскам, ажыццявіла ленінскую праграму нашай партыі «самаазначэння нацый аж да дзяржаўнага іх аддзялення», тым самым паказала працоўным усіх краін узор революцыйнага вырашэння нацыянальнага пытання пры дыктатуры пролетарыята.

Наперакор апартуністам усіх масцей, адмаўляючым социялістычны характар Окцябрскай революциі і перамогу социялістычнага будаўніцтва ў СССР, наперакор контрреволюцыйнаму трацкізму, прадракаўшаму немінучае перараджэнне дыктатуры пролетарыята, наперакор абяліхадзяржаўным шавіністам і мясцовым нацыяналістам, якія асабліва падкраслівалі немагчымасць пролетарскай революциі ў нацыянальных краінах былой царскай Расіі, —пролетарыят і калгаснае сялянства СССР пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і вялікага Сталіна, пры падтрыманні сусветнага пролетарыята, пераможна і цвёрда ўступілі ў перыяд социялізма. Пабудаваўшы фундамент социялістычнай эканомікі, ліквідуючы апошнія астаткі капіталістычных класаў, перабіваючы на социялістычны лад прамысловасць і сельскую гаспадарку, СССР канчаткова і беспаваротна замацаваўся на социялістычным шляху.

### ПЕРАМОЖНЫ ШЛЯХ СОЦЫЯЛІЗМА Ў СССР.

У гады першай пяцігодкі СССР прайшоў вялікі шлях да стварэння бяскласавага социялістычнага грамадства. Канчаткова перамагла палітыка індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі. За апошнія два-тры гады выраслі такія волаты-заводы, як Магнітагорск, Кузнецк, Днепрадзэс, Уралмаш, Луганскі паравозабудаўнічы, Краматорскі, Горлаўскі і інш. У 1930 годзе СССР выплаўляў у суткі 13.000 тон чыгуну, а ў 1934—30.000 тон. У 1930 годзе мы выраблялі 9.000 трактараў у год, зараз—90.000. У 1930 годзе мы выраблялі 2.000 аўтамабіляў у год, зараз—72.000.

На падставе эканамічнага росту краіны безупынна паляпшаецца матэрыяльна-бытавое становішча рабочых і працоўных. Праведзен 7-гадзінны рабочы дзень, ліквідавана беспрацоўе, больш чым у тры разы павялічыўся фонд заработнай платы і амаль у тры разы вырас фонд социялыстага страхавання. Расце культурны ўзровень працоўных. З 67 проц. у канцы 1930 года грамотнасць нашага насельніцтва павялічылася зараз да 92 проц. Тыраж газет з 12,5 мільёнаў вырас да 38 млн. экземпляраў.

Выратаванне чалавецтва паказала ўсяму свету рост тэхнікі нашай авіяцыі, бязмежную адданасць большэвіцкай справе мільённых мас, даўшых героіў Совецкага Саюза.

У Совецкім Саюзе, у краіне калектыўнай, буйной механізаванай сельскай гаспадаркі за апошнія гады створаны сотні тысяч калгасаў, тысячы соўгасаў і МТС. У 1930 годзе ў нашай краіне было толькі 158 МТС, а зараз — 3.500. На калгасных і соўгасных палях працуюць больш 250 тысяч трактараў. Калектывізацыя ахоплена да 65 проц. сялянскіх гаспадарак СССР. Працоўнае і калгаснае сялянства канчаткова і беспаваротна стала пад пераможным чырвоным сцягам социялізма.

### БЕЛАРУСЬ КАЛАНІЯЛЬНАЯ СТАЛА КРАІНАЙ БУЙНАЙ ІНДУСТРЫІ І МАШЫННАЙ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Беларусь была да Окцябра адной з найбольш адсталых акраін царскай Расіі. Па ўсёй Беларусі ў 1913 годзе было 715 дробных прадпрыемстваў з колькасцю рабочых у 13.000 чалавек. Прадукция усяго прамысловасці ацэньвалася толькі ў 47 мільёнаў рублёў. Рабочыя складалі ў Беларусі толькі 0,57 проц. усяго складу насельніцтва, у той час, як нават у прамысловая адсталай даваенай Расіі процант рабочых складаў 1,43. Беларусь была пераважна сельскагаспадарчай краінай. Але зямля была ў памешчыкаў. Беднота і батрацтва задыхаліся ад эксплуатацыі і голаду. Палітычнае бяспраўе і нацыянальны ўціск дапаўнялі агульны малюнак ніжкага эканамічнага становішча працоўных Беларусі.

Цяжкія пазы вялікадзяржаўнай барацьбы, прамадзянскай вайны, шматлікіх акупацый прайшоў пролетарыят і працоўнае сялянства нашай краіны, пакуль пры дапамозе рабочых і сялян усёй Расіі Окцябрская революция канчаткова не перамагла на Беларусі. Морам крыві, агнём пажараў гарадоў і вёсак, смерцю дзесяткаў тысяч лепшых сваіх сыноў заплаціла Совецкая Беларусь за сваё вызваленне ад акупантаў, ад [illegible] і памешчыкаў.

Сёння, да XVII гадавіны Окцябра, Беларуская ССР разам з усім Совецкім Саюзам прыходзіць з найвялікшымі перамогамі на ўсіх участках социялістычнага будаўніцтва.

Пры выключна ўважлівай і велізарнай дапамозе з боку СССР, гаспадарка Беларусі, уся яе эканоміка, социялістычная культура па тэмпах свайго развіцця іншы значна вышэй, чым тэмпы развіцця ў цэлым па ўсяму Совецкаму Саюзу. Калі ў 1913 годзе валавая прадукция прамысловасці Беларусі складала 0,87 проц. ў адносінах да ўсёй прамысловасці царскай Расіі, то ўжо ў 1932 годзе яна складала 2,5 проц. да прамысловасці ўсяго Саюза. Прычын не трэба забываць, што СССР за апошнія гады нагуляў значна павялічыў сваю індустрыю.

Зараз у прамысловасці БССР занята 145.000 рабочых, у тым ліку 45 проц. жанчын-работніц. Галавая прадукция прамысловасці БССР апаноўваецца ў 1.308 мільёнаў рублёў, або ў 28 раз больш параўнальна з дарэволюцыйным часам.

За першую пяцігодку ў прамысловасць БССР укладзена 338 млн. руб., а ў 1933 годзе—400 млн рублёў. Пушчаны ў ход буйнейшыя прадпрыемствы.

На падставе індустрыялізацыі краіны БССР, ліквідуючы пяжкую спадчыну сталыпінчыны і прычэпаўшчыны, мае зараз велізарныя дасягненні ў справе социялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Першая пяцігодка і два гады другой большэвіцкай пяцігодкі карэнным чынам змянілі социяльны і эканамічны твар беларускай вёскі, звыш 60 проц. бядняцкіх і сярэдняцкіх гаспадарак аб'яднаны ў калгасы. Арганізавана звыш 10.000 буйных калгасных гаспадарак, ліквідавана ў асноўным кулацтва як клас. Арганізавана 429 соўгасаў, 65 машына-трактарных станцый. На палях працуюць 3500 трактараў, складаная сельска-гаспадарчыя машыны.

Арганізаваныя партыяй палітаддзелы ў МТС і соўгасах ставілі рашаючы пералом у справе социялістычнага ўмацавання соўгасаў і калгасаў. Ужо з [illegible] гады лозунг праварыра нашай партыі тав. Сталіна—«зарабіць калгасы большэвікімі, а калгаснікаў заможнымі»—мы маем небывалы бядным эканамічна ўмацаванне калгасаў і соўгасаў, а [illegible] рост матэрыяльнага ўзроўню калгасаў і калгаснікаў. Нашай бліжайшай задачай з'яўляецца—на аснове безупыннага ўмацавання гэтых поспехаў правесці суцэльную калектывізацыю.

Совецкая Беларусь пад большэвіцкім кіраўніцтвам КП(б)Б на чале з тав. Гікало дабілася ў апошнія два-тры гады, асабліва ў гэтым годзе, велізарных поспехаў у выкананні [illegible] пяцігадовага плана.

Поспехі, умацавання сельскай гаспадаркі. Веснавая сяўба гэтага года была закончана на 25 дзён раней мінулага, уборка зернавых на 10 дзён, уборка бульбы на 50 дзён, уборка ільну на 70 дзён раней мінулага года. Своечасова быў паднят папар, засеяны азімыя, узараны палі пад зяблева. БССР у ліку першых рэспублік і абласцей Совецкага Саюза выканала план хлебапаставак і бульбазагатовак. Упершыню БССР у гэтым годзе пры на стойлівай рабоце новага НКЗ тав.

Бенека выканала гадавы план мелірацыі асушыўшы 100.000 гектараў забалочаных зямель.

На працягу 3-х з паловай год БССР выконвае і перавыконвае план мабілізацыі сродкаў насельніцтва і дзяржаўных даходаў, гамацэнуючы гэтым самым матэрыяльную базу социялістычнага будаўніцтва і абароны нашай краіны.

Большэвіцкае кіраўніцтва КП(б)Б паставіла Совецкую Беларусь у першыя рады сярод перадавых орденаносных чырвонасцяжных рэспублік і абласцей Совецкага Саюза. Былая забытая і адсталая калонія царская Расіі, БССР пад кіраўніцтвам КП(б)Б ператварылася ў адну з перадавых рэспублік і абласцей Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік.

### ПОСПЕХІ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА БУДАЎНІЦТВА І УЗДЫМ МАТЭРЫЯЛЬНАГА СТАНОВІШЧА ПРАЦОЎНЫХ МАС

Асабліва велізарных поспехаў, пад кіраўніцтвам КП(б)Б рабочыя, Калгаснікі і працоўныя масы БССР дабіліся на фронце культурнага будаўніцтва, у развіцці нацыянальнай па форме і социялістычнай па зместу культуры.

У дарэволюцыйнай Беларусі было 72 проц. няграматнага насельніцтва. Зараз БССР у асноўным ліквідавала няграматнасць. Па ўсеагульнаму абавязковаму навучанню Совецкая Беларусь заняла адно з першых месц сярод брацкіх совецкіх рэспублік.

Да революциі Беларусь не мела ні адной вышэйшай школы. Зараз у БССР ёсць 26 ВНУ, універсітэт, якія рыхтуюць кадры для будаўніцтва нашай социялістычнай гаспадаркі і культуры. Совецкая ўлада забяспечвае працоўных [illegible] нацыянальнасцей, пражываючым на тэрыторыі БССР, свабоднае нацыянальна-культурнае развіццё. Створан Польскі рабочы тэатр, Рускі дзяржаўны тэатр, Беларускі оперны тэатр. Тэатр рабочай моладзі. Развіваецца совецкая літаратура, кнігі, газеты і кіно. Растуць пролетарскія кадры пісьменнікаў, літаратараў, мастакоў, артыстаў. Нашы пісьменнікі далі шмат каштоўных твораў, актыўна ўдзельнічалі на першым ўсесаюзным з'ездзе совецкіх пісьменнікаў.

Рост прамысловасці, гаспадаркі і культуры стварылі ўмовы для рашучага паляпшэння матэрыяльна-бытавога становішча рабочых, калгаснікаў і шырокіх працоўных мас. Лепшае жыццё прыйшло для працоўных на змену далёкаму жуданому мінуламу. Нашы калгаснікі ў сваёй масе ўжо становяцца заможнымі. Яны прадаўляюць патрабаванні на патэфоны, нажэлезныя ложкі, шафы, карціны і т. д. Нашы калгаснікі цікавяцца і чытаюць кнігі, газеты, дзе лавую гаспадарчую і мастацкую літаратуру.

### ПОСПЕХІ БАРАЦЬБЫ КП(б)Б У ПРАВЯДЗЕНЬНІ ЛЕНІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ

Поспехі, з якімі мы сустракаем XVII гадавіну Окцябрскай революциі, з'яўляюцца пераможным трыумфам ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР.

У сваім артыкуле ў «Правде» тав. Гікало пісаў: «Нацыянальная палітыка партыі заключаецца не толькі ў мерапрыемствах культурнага парадку па лініі правядзення беларусізацыі, па лініі, стварэння беларускіх школ, выпуску беларускіх кніг, распрацоўкі мовы і т. д. Нацыянальная палітыка прадстаўляе сабой суму мерапрыемстваў, накіраваных на знішчэнне фактычнай, г. зн. гаспадарчай і культурнай адсталасці нацыянальнасцей саюза рэспублік».

Стварэнне сотень новых фабрык, заводаў, арганізацыя тысяч калгасаў, будаўніцтва дарог, больніц, дзіцячых ясель побач са стварэннем Акадэміі навук, тэатраў, школаў, з'яўляецца важнейшым здабыткам Окцябрскай революциі, вялікім дасягненнем ленінскай нацыянальнай палітыкі, якая разбурыла былыя прынцэпіальныя нарэды. Іменна таму ўсе класава-варожыя нам элементы з такой яраццю і шавіністам атакавалі нашу маладую совецкую дзяржаву, стараліся сарваць нашу мірнае социялістычнае будаўніцтва.

Ці не факт, што беларускія контрреволюцыйныя пацюкі змыкаліся на контрреволюцыйнай глебе з украінскімі буржуазнымі нацыяналістамі, пятлюраўцамі, социял і нацыянал-фашыстамі Заходняй Беларусі, з'яўляючыся простай агентурай імперыялістычных інтэрвентаў. Рабочыя і сяляне Совецкай Украіны і Беларусі добра памятаюць, калі Пятлюра і Лёскі і Ластоўскія прадавалі Украіну і Беларусь заходнім імперыялістам. Фактамі даказана, што беларускія контрреволюцыянеры на чале з прамакратарам Ігнатоўскім былі платнымі агентамі контрразведак імперыялістычных дзяржаў.

### РАСЦЕ НЕБЯСПЕКА НОВАЙ ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ

У той час, як вялікі Саюз Совецкіх Рэспублік прыходзіць да 17-й гадавіны Окцябрскай революциі з гіганцкімі поспехамі ў будаўніцтве социялізма, увесь капіталістычны свет перажывае востры эканамічны крызіс.

Асабліва паралізаваў крызіс Заходнюю Беларусь, тут галеча, голад і беспрацоўе набываюць надзвычай вялікія размеры, бо да капіталістычнага ўціску прыбяўляецца яшчэ і каланіяльны характар эксплуатацыі.

У інтарэсах польскай прамысловасці існуючыя фабрыкі ў Заходняй Беларусі закрываюцца. Так, напрыклад, закрыты за мінулыя гады запаладжаныя фабрыкі ў Вільні, Беластоку і Слоніме. Калі ўзяць агульны паказальнік прамысловасці па Заходняй Беларусі ў 1928 годзе за 100, то ў 1931 г. мае зніжэнне да 60 проц., а ў 1933 г.—да 35 проц., г. зн. амаль на дзве трэці.

Голад у вёсках Заходняй Беларусі набыў такія размеры, што нават польскі буржуазны друк прымушаны пісаць аб неабходнасці прыняцця мер, каб не давесці сялянства да паўстання.

У немачных імкненнях знайсці выхад з крызіса, буржуазія становіцца на шлях адкрытай фашысцкай дыктатуры для прыдушэння революцыйнага руху пролетарыята, на шлях падрыхтоўкі новай імперыялістычнай вайны, у першую чаргу супроць СССР—краіны, будуючай социялізм.

Шлях работы-сялянскі ўрад змагаецца за мір. Гэта вялізна працоўным і ўсім чесным людзям усяго свету. Наш працоўны народ занят мірным будаўніцтвам социялізма.

Аднак, проба памятаць, што 17-ю гадавіну Окцябра мы сустракаем у складаным міжнародным абстаноўцы. [illegible] захапіла Манчжурыю, ператварыла яе ў плацдарм антысовецкай вайны, систематычна правакуе ўзброеныя правакацыі на межах Совецкага Саюза. Рукамі японскай ваенщчыны арганізуецца вялікае белабандытаў на Кітайскую Усходнюю чыгунку для таго, каб справаковаць нас на вайну.

На шлях міжнародных авантур і распальвання вайны стала фашысцкая Германія. Забойствам прыхільнікаў, прэм'ераў, міністраў на загадзе фашысцкіх арганізацый буржуазія імкнецца сарваць мірныя адносіны памёж дзяржавамі.

Важнейшай гістарычнай з'явай гэтага года з'яўляецца ўступленне СССР у Лігу нацый. СССР уступіў у Лігу нацый таму, што ў даных канкрэтных умовах Ліга нацый з'яўляецца бутафорам, як указаў тав. Сталін, затрудняючым узмацнэнне воўчай імперыялістычнай вайны. Змагаючыся за мір, намагаючы ўсе сілы для захавання міру, мы адначасова не павінны забываць, што важнейшым фактарам захавання міру з'яўляецца ўмацаванне могутнасці нашай слаўнай Чырвонай арміі, рост абараназдольнасці нашай краіны.

У той час, калі буржуазіі ў пошуках выхаду з крызіса становіцца на шлях вайны, пролетарыят і працоўныя масы капіталістычных краін жыруюць, давядзеныя крызісам і беспрацоўем да адчаю, становяцца на шлях революциі.

Апошні год адзначаецца абгрмаваным, не толькі ў краіне, дзе революцыйны ны працэс быў безупынным (Іспанія, Кітай) і дзе революцыйны ўздым вясуцінна нарастаў (Польшча, Чэха-Славакія, Англія, Амерыка), але і для такіх краін, як Галандыя і Швейцарыя. Ён апазаўся бурным не толькі ў галіне рабочага руху, але і ў галіне сялянскага і нацыянальна-вызваленчага руху.

Крывавы фашысцкі тэрор не можа знішчыць надыходзячую пролетарскую революцыю. Суседнія пролетарыят, загартоўваючы свае сілы, яднае свае рады вакол Комуністычнага Інтэрнацыяла, і з бязмежным чырвоным сцягам гросіла ідзе на звяжэнне буржуазіі і канчатковае знішчэнне капіталізма.

Гэта прымушае нас з яшчэ большай упартасцю змагацца за далейшыя перамогі на ўсіх франтах социялістычнага будаўніцтва. Выключна важнае значэнне мае рост прадукцыйнасці працы і паляпшэнне якасці працы, выкананне важнейшых указанняў тав. Сталіна аб асваенні новых заводаў, новай тэхнікі. Трэба змагацца за тое, каб поўнасцю скарыстаць ка фабрыках і заводах рабочы дзень, канчаткова знішчыць брак і дабіцца на кожным прадпрыемстве, у кожным калгасе і соўгасе высокай якасці прадукцыі.

Барацьба за далейшае ўмацаванне калгаснага ладу, за выкананне лозунга тав. Сталіна аб калгасной заможнасці, барацьба за суцэльную калектывізацыю, за выкананне калгаснымі і арцелькамі ўсіх абавязацельстваў перад дзяржавай і хутчэйшы падъём вытвлагадоўлі — такія асноўныя задачы росту калгаснай вёскі.

XVII з'езд ВКП(б) з усёй большэвіцкай рашучасцю паставіла праблему чыгуначнага і водзнага транспарта. Задача совецкіх і гаспадарчых арганізацый—аказваць рашучую дапамогу ў вырашэнні гэтых вузлавых пунктаў нашай гаспадаркі.

Прахоўваючая спрэвадачна-перавыбарчая кампанія ў советы павінна стаць важнейшым рагаром і стымулам для выканання гітанцкіх задач другой пяцігодкі. Кожны дэпутат павінен аддаваць перад сваімі выбаршчыкамі (як ён на справе вёў барацьбу за генеральную лінію партыі і за выкананне рашэнняў партыі і ўрада, як ён выканаў наказ сваіх выбаршчыкаў.

Спецыфічны пераямбары советаў, мы павінны на аснове наказаў выбаршчыкаў перабудаваць работу ўсіх звенняў нашага совецкага апарата для канчатковага знішчэння бюракратызма, фасаднабасаці, пытаніны. Трэба нашчыцца ножнай установе і кожнаму работніку працаваць так, як працуе наш ЦК КП(б)Б і тав. Гікало, г. зн. працавець по-большэвіцку, ініцыятыва, па-дзелавому, анаротыўна рэагуючы на ўсе недахопы і адстаючыя ўчасткі.

Маналітнасць і згуртаванасць нашых партыі, згуртаванасць радоў работы, калгасных і працоўных мас, пад сцягам Маркса-Леніна-Сталіна за далейшае будаўніцтва социялізма забяспечаць моцнай краіне пад кіраўніцтвам тав. Сталіна, перамаганне ўсіх сустракаючых на шляху да стварэння бяскласавага грамадства — забяспечаць набліжэнне сусвет нага Окцябра.

Вырытая і разтромленая ў БССР контрреволюцыйная нацыяналістычная шпіёнская арганізацыя з удзелам былых послоў польскага сейма —Мятлы, Рак-Міхайлоўскага, Дзярчаніна, Какуцкага і інш. мела сваёй метай наладзіць інтэрвенцыю супроць БССР і СССР. Устаноўлена так сама, што нацыянал-дэмакраты ў свой час у Наркамземе, на чале з Крыгановым і Масковым, тварылі кулацкую хуткарызацыю, разбуралі калгасы і калгасы займаліся прыпісваннем коням меншыта, знішчэннем паголоўя маладняка, нападзеннем у трактарным парку і т. д. Яны таксама моглі непасрэдную сувязь з контрреволюцыямі імперыялістычных дзяржаў і працавалі за іх сродкі і па іх заданню.

Не асабліўчы нашу класавую дбайнасць мы таму павінны і ў далейшым весці з беларускай контрреволюцыйнай падпямяўнічнай самую мілакую і бесштадную барацьбу.

Аднак, таварышы, з гэтага не вынікае, што барацьба з вялікарускім ці іншым шавінізмам павінна быць хоць на мінуту аслабена. Канцэнтруючы ўдар на мясцовым беларускім нацыянал - дэмакратызму, які з'яўляецца галоўнай небяспекай, мы ў той жа час павінны ўзмацніць барацьбу з вялікадзяржаўным і іншымі шавінізмамі за ўсямернае выхаванне шырокіх працоўных мас у духу пролетарскага інтэрнацыяналізма.

### ГОРА-БУДАЎНІК

У Гомелі па Сялянскай вуліцы жылсаюз пачаў рамантаваць дом № 64, дзе жывуць 10 сем'яў. Рамонт дома даручылі прарабу Кавалерчыку, які ў будаўніцтве нічога не разумее, бо па прафесіі з'яўляецца зубным тэхнікам.

Па рамонту дома працуюць адзін плотнік і 4 падручных. Работа ідзе надзвычайна марудна, бо няма матэрыяла. Пачнуць, напрыклад, рабочыя класці падлогу, не хапае дошак, тады кідаюць гэту работу і бяруцца за другую.

Прараб Кавалерчык, ведаючы, што рабочым няма чаго рабіць, сам да паўдня непрыходзіць на работу, а сядзіць дома і робіць зубы або прадае яблыкі ў садзе, а рабочыя да паўдня нічога не робяць.

ПАВЕРСКІ.

## АБ АГЛЯДЗЕ „ЗВЯЗДЫ“ ПРА „ПАЛЕСКУЮ ПРАЎДУ“

### *Пастанова бюро Гомельскага ГК КП(б)Б*

1. Факт ганебнага адставання і знаходжання раёна на чорнай дошцы з'яўляецца вынікам зусім дрэннай барацьбы гаркома, горсовета, палітаддзела МТС, у асаблівасці гарза—тав. Жданові ча і «Заготільна» — т. Драгунскага, якія агідна ігнаравалі важнейшыя ўказанні ЦК КП(б)Б і «Звязды» аб арганізацыі добраякаснай апрацоўкі і здачы ільну і рашэнні ГК на гэтаму пытанню ад 17 жніўня і 1 кастрычніка 1934 г.

Адзначыць, што з боку райупаўкамзага тав. Бучукаса не былі своечасова прыняты меры да недапушчэння маючагася прарыву.

2. Буйнейшай і недаравальнай памылкай рэдакцыі «Палескай праўды» і тав. Бугрова з'яўляецца тое, што «Палеская праўда» на сваіх старонках не выкрыла гэтага агіднага ігнаравання дырэктыў ЦК, ГК і палітаддзела МТС і сама не арганізавала канкрэтнай барацьбы за правільную арганізацыю апрацоўкі і здачы ільновалакна, барацьбы з тымі (не зважаючы на асобы), хто ігнаруе рашэнні ЦК і ГК.

Гэтым «Палеская праўда» сама паказала прыклад недавацэнкі барацьбы за лён, наўмыснага канкрэтна арганізаваць гэту работу і выкрываць віноўнікаў не зрыву, нават пасля рашэння рэспубліканскай камісіі на спаборніцтву аб заваёўванні раёна на чорную дошку. Гэта становішча поўнасцю пацвярджае правільнасць агляду «Звязды» ад 28 кастрычніка 1934 года, гэта паказвае, што «Палеская праўда» не перабудавала сваёй работы на аснове рашэнняў ЦК ВКП(б) аб гомельскай партарганізацыі.

Гэтыя недахопы «Палескай праўды» характэрны не толькі ў галіне барацьбы за лён, але і ў галіне работы прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў цэлым, калектывізацыі, культурна-бытавых патрэб рабочых і калгаснікаў і разгортвання крытыкі і самакрытыкі.

Выходзячы з гэтага бюро ГК пастанаўляе:

1. Паставіць на від тав. Бугрову і парткому рэдакцыі за ўказанні буйнейшыя памылкі і прапанаваць ім неадкладна выправіць і зрабіўшы газету баявым большэвіцкім арганізатарам барацьбы комуністаў, комсамольцаў, рабочых і калгаснікаў на ўсіх участках работы.

2. Указаць тав. Валюкевічу на тое, што МТС недастаткова разгарнула канкрэтную работу па ажыццяўленню рашэнняў ЦК.

3. Паставіць на від т. Драгунскаму за ігнараванне рашэнняў ЦК і ГК.

4. У сувязі з выключна дрэннай работай гарза па асноўных пытаннях сельскай гаспадаркі (планаванне сяўбы, арганізацыя сельгасработ і ўліку, калектывізацыі і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў, павышэнне жывёлагадоўлі і інш.) заслухаць на партгрупе горсовета справаздачу тав. Жданові ча, рашэнне партгрупы заслухаць на чарговым бюро ГК.

5. Бюро асабліва падкраслівае, што выкананне п. 1 лістапада плана па ільну і інш. сельгас. абавязацельстваў (бульба, мяса, фінансы і інш.) застаецца на ўзроўні ганебнага адставання і што справай партыйнага гонару сельскіх комуністаў, гарадскога актыва ГК, горсовета і палітаддзела МТС і шэфствуючых арганізацый з'яўляецца скананне да свята Окцябрскай революциі планаў па ільну і іншых сельгаспадарчых абавязацельствах і арганізацыя магутнага прыліву ў калгасы, у галіне якога Гомельшчына ганебна адстае, нават ад сярэдняга рэспубліканскага процанта калектывізацыі.

Гэта рашэнне і агляд «Звязды» абгаварыць сярод партарганізацыі і работнікаў рэдакцыі, апублікаваць у друку і паведаміць «Звязде».

## ПА СЛЯДАХ НЕАПУБЛІКАВАНЫХ ПІСЕМ

Селькор Асіпоўскі паведаміў у рэдакцыю аб тым, што ветурач соўгаса «Ануфрава» КАСАРЖЭЎСКІ займаецца злачынствам. Ён прадаў без ведама адміністрацыі карову.

Уездэнскі РК КП(б)Б паведамляе, што факты пацвердзіліся. Касаржэўскі перадан суду.

* * *

Калгаснік КАВАЛЕНКА пісаў у рэдакцыю аб тым, што ў калгасе імя Сталіна старшы конюх А. ШУЛЬГАЧ і кладаўшчык ІВАНЮШЧАНКА сістэматычна раскрадваюць калгасны авёс.

Начальнік Хойніцкага палітаддзела паведамляе, што факты, паказаныя ў пісьме тав. Каваленка, пацвердзіліся. Справа на Шульгача і Іванюшчанкі перадана пракурору.

* * *

Старшыня калгаса «Ударнік» СУСЬКО п'янствуе, дапускае поўную безгаспадарчасць. У калгасе прапала 6 коней. Аб гэтым паведаміў калгаснік калгаса Будкевіч і Шульга.

Нараўлянскі РК КП(б)Б паведамляе, што факты пацвердзіліся. Сусько з работы старшыні знят. Яму вынесена суровая вымова.

* * *

* Асіпавіцкі райпрофсавет піша, што факты прыведзеныя ў пісьме рабкора Б. Ф. з торфзавода «Новы мост» «Тарфком пад замком» поўнасцю пацвердзіліся. Старшыня тарфкома Дрэнь сапраўды ніякай культурна-масавай работы не праводзіў, не дапамагаў дырэкцыі ў наборы рабочай сілы.

Дрэнь з пасады старшыні тарфкома знят, замест яго паслан тав. Баранаў.

* Аб нядбайных адносінах старшыні калгаса «Паляўнічы», Пухавіцкага раёна, да гаспадаркі пісаў у рэдакцыю калгаснік Касцюк.

— У калгасе, — пісаў аўтар, — за 1933 год загінула 9 коней, 1 карова, разбазарана 6 цэнтн. насеннай вікі, 8 цэнтн. насеннай канюшыні і т. д. Працадні па 2-3 месяцы ў кніжкі не запісваліся.

Як паведамляе пухавіцкі райзо, факты, прыведзеныя аўтарам, ЦАЛКАМ ПАЦВЕРДЗІЛІСЯ. Следчымі органамі праведзена следства, старшыня калгаса ЖАЎНЕРЧЫК знят з работы і прыцягваецца да крымінальнай адказнасці.

* Аб бяздзейнасці праўлення, засмечанасці і безгаспадарчасці ў калгасе «ШЛЯХ СОЦЫЯЛІЗМА», Вышацкага сельсавета, (Гарадоцкі раён) пісаў у «Звязду» калгаснік КУКЕНКА.

Пракурор Гарадоцкага раёна паведамляе, за бяздзейнасць старшыня калгаса Сянькоў асуджан на 6 месяцаў прымусовых работ і адклікан з калгаса. Праведзены перавыборы праўлення і рэўкамісіі калгаса. Купакі — Хабатоў А., Прудзікаў В. Лазаноў А., Арэхаў І., Арэхаў С. з КАЛГАСА ВЫКЛЮЧАНЫ.

* Калгаснік Я. К. пісаў у рэдакцыю, што група работнікаў БАБУЙНІЦКАГА сельсавета (Петрыкоўскі раён) Зубар, Азём, Агалец і Кандрашэвіч сістэматычна абвяжэюць сяўпян і разбазараюць калектыўныя сродкі. Растрачана 4.125 руб.

Петрыкоўскі райпракурор паведамляе, што факты пры праверцы поўнасцю пацвердзіліся. Растратчыкі ЗУБАР, АЗЁМ, АГАЛЕЦ і КАНДРАШЭВІЧ асуджаны на розныя тэрміны пазбаўлення волі.

# НЕ САМАСУПАКОЙВАЦЦА, ЗМАГАЦЦА ЗА НОВЫЯ ПЕРАМОГІ

**В. КІРЫЛАЎ**

НАЧ. ПАЛІТАДДЗЕЛА АРШАНСКАГА АДДЗЯЛЕННЯ ЭКСПЛААТАЦЫІ

У выніку разгортвання партыйна-масавай работы, барацьбы за заваяванне пярэдніцтва ва ўсесаюзным спаборніцтве на лепшую станцыю Аршанскае аддзяленне дабілася выканання асноўных вытворчых паказальнікаў.

Лепшымі станцыямі па выкананню ўсіх умоў усесаюзнага спаборніцтва з'яўляюцца Менск-таварная і Негарэлае. Ст. Менск-таварная зараз заваявала першае месца на МББ чыгункі і заняла чацвертае месца па Саюзу.

Аршанскае аддзяленне заняла першае месца сярод аддзяленняў дарогі. Але што фактычна гэта значыць? А тое, што мы з'яўлямся па сутнасці лепшым з горшых аддзяленняў на дарозе. Між тым сярод асобных таварышоў гаспадарнікаў і партыйных работнікаў праскальзваюць ноткі благадушша і самасупакоенасці. Рана. вельмі рана гаварыць аб тым, што мы перадавое ўжо аддзяленне.

Нікому не сакрэт, што працуем мы яшчэ дрэнна. Канцылярска-бюракратычныя метады кіраўніцтва, так рэзка асуджаныя партыяй і ўрадам, канчаткова недабіты, яны ўсё яшчэ тармозяць большэвіцкую перабудову транспарта.

Такія паказальнікі, як следаванне цягнікоў па раскладу, камерцыйная хуткасць, нормы прастою вагонаў пад грузавымі аперацыямі, аварот вагона — выконваем мы надзвычай дрэнна.

Галоўныя прычыны невыканання транспартам заданняў, як гэта ўсім правільна указалі на апошняй эксплаатацыйнай нарадзе тт. КАГАНОВІЧ, АНДРЭЕЎ і ЗІМІН, заключаюцца ў нашым няўмецкі выкарыстаць тыя агромадныя ўнутраныя рэзервы, якія мае транспарт.

Аб наяўнасці вялікіх рэзерваў на ўмовах нашага аддзялення сведчыць рад фактаў, пацверджаных на практычнай рабоце.

Па ініцыятыве лепшых ударнікаў станцыі Менск-таварная — грузчыка Тарпоўскага і начальніка станцыі тав. Фралова ўведзена так званая «фабрычная камерцыйная марка». (Вопыт гэты ў № 2041 «Звязды» асветлен).

Трэба сказаць, што гэта, здавалася-б на першы погляд невялікае мерапрыемства, дало выключны эфект. Сярод грузчыкаў і вагаўшчыкоў разгарнулася шырокае спаборніцтва за гонар сваёй маркі. Камерцыйны брак на станцыі амаль ліквідаваны. Павялічылася скарыстанне грузападёмнасці вагона. Вось канкрэтныя результаты: калі да ўвядзення маркі грузіліся ў 16,5 тонны вагон 253 яшчыкі піцявой солы, то цяпер грузіцца 302 яшчыкі, лямпу — адзавелна 39 і 46 цокаў, варовак—66 і 88 цокаў, пукерак — 360 і 408 яшчыкаў, начэння — 178 і 251 месца і т. д.

Вопыт Менска падхоплен другімі станцыямі [illegible] аддзялення.

Вялікае [illegible] стаўму значэнню мерапрыемства [illegible] праводзіцца зараз у аддзяленні у справе паскарэння абароту вагонаў.

У чым яно заключаецца? А вось у чым. Да гэтага часу абгрунтаванасць ходзіці ў кавроскім час, без цвёрдага графіка. У результаце такой непрадказанасці падачы станцыі не ведалі, калі атрымаюць вагоны для пагрузкі і калі [illegible] вагоны будуць убраны, з-за чаго адбываліся [illegible] і непрадуктыўныя прастоі вагонаў.

Старшы дыспетчар нашага аддзялення тав. Маскаў выкінуў прапанову, падтрыманую лепшымі ўдарнікамі, дыспетчарамі і рабочымі, аб уведзенні цвёрдага графіка абсмотных пялядоў, аб максімальным скарыстанні сваіх прыгарадных пялядоў для выкідкі з падачых станцый пагружаных і разгружаных вагонаў. Кіраўніцтва аддзялення ўхваліла гэта мерапрыемства і ўвяло такі графік з 15 кастрычніка.

Што дае нам гэта мерапрыемства? Яно перш за ўсё высвятляе станцыю, дае жоўсцкія тэрміны для пагрузкі і выгрузкі. Першыя пяць дзён аддзяленне гэта мерапрыемства знізілі прастой вагонаў у сярэднім па аддзяленню на 4 гадзіны, а па асобных станцыях мы дабіліся значна большага эфекту.

У сувязі з гэтым мерапрыемствам увядзена значнае [illegible] сярод дыспетчараў, якое дае магчымасць пазнаць адзаначыць кожнага дыспетчара за выкананне плана і ўзняць якасць дыспетчарскага камандавання.

Цэнтральны камітет КП(б)В і асабіста тав. ГІКАЛО ўдзяляюць велізарную ўвагу рабоце нашага а

# Забяспечыць пагалоўны ўдзел выбаршчыкаў у выборах — важнейшая палітычная задача ўсіх партарганізацый

## НЯМА ЗВАРОТУ ДА СТАРОГА

**ЗАРЫЧКА МАКРЫДА,**

**Новавыбраны член Сароеўскага сельсовета, Чэрыкаўскага раёна.**

1 лістапада на сходзе першага выбарчага ўчастка вёскі Шароеўкі мяне аднагалосна выбралі членам новага складу сельсовета. Усе 200 выбаршчыкаў нашага ўчастка галасавалі за тое, каб я з'яўлялася членам сельсовета. Гэта для мяне самы вялікі гонар за ўсе 24 гады майго жыцця.

І сапраўды, ці магла калі-небудзь марыць бедная сялянка аб тым, каб атрымаць такое ганаровае давер'е мас? Ці марыла хаця-б мая старая маці, што прыйдзе час, калі яе дачка будзе кіраваць брыгадай у калгасе і прымаць удзел у кіраўніцтве дзяржавай? Ніколі. Адзнае, што заўсёды турбавала маіх бацькоў, як і большасць сялян вёскі Шароеўкі, гэта — як-бы здабыць кавалак хлеба. Толькі совецкая ўлада пад кіраўніцтвам партыі Леніна-Сталіна ўказала шматмільённаму сялянству новы шлях жыцця і працы—шлях калгасаў, дала магчымасць працоўнай жанчыне нараўне з мужчынам будаваць сваю светлую будучыню.

Я памятаю, калі 8 месяцаў назад мяне выбралі брыгадзірам, я заўсёды клапацілася аб тым, каб справіцца з работай. Я была занята аднымі думкамі: як вывесці сваю брыгаду ў перадавыя. Я не шкадавала сіл, уставала рана, цэлы дзень знаходзілася ў брыгадзе, дабівалася выканання намечаных планаў. Хутка я ўбачыла, што ніякіх намаганні не прападаюць даромма. З дня ў дзень работа ў маёй брыгадзе наладжвалася, мая брыгада першай у сельсавеце закончыла ўборку ўраджаю, своечасова разлічылася з дзяржавай хлебам, бульбай, ільном.

Цяпер перада мною другая, не менш адказная задача — выканаць наказ выбаршчыкаў, вывесці свой участак на перадавое месца ў сельсавеце.

З чаго я думаю пачаць сваю работу ў сельсавеце?

У нашай вёсцы яшчэ 48 аднаасобнікаў. Цяпер большасць часу прыдзецца аддаць на растлумачэнне аднаасобнікам пераваг, якія атрымалі калгаснікі, дасягненняў, якіх мы дабіліся ў нашым калгасе, каб выклікаць новы прыліў у калгас.

Другая работа, гэта — неадкладнае выкананне кожнай гаспадаркай майго ўчастка сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай.

І трацяя задача — ужо сёння пачаць падрыхтоўку да сяўбы. Трэба спадзявацца, што пры дапамозе сельсовета, мясцовай партарганізацыі я гэтага на сваім участку дабіюся.

Сёння я хачу яшчэ раз паўтарыць тое, што ўчора сказала на выбарчым сходзе:

— Няма звароту да мінулага. Назаўсёды перакрэслена старая хлуслівая пагаворка, што курыца не птушка, баба не чалавек. Жанчына ў калгасе, на заводзе, у сельсавеце — вялікая сіла.

## ТАМ, ДЗЕ ПА-ГІСТРАТЫЧНАМУ ПРАВОДЗЯЦЬ СП АВАЗДАЧНУЮ КАМПАНІЮ

З 4 лістапада пачаліся справаздачныя сходы па вёсках **Лошніцкага сельсовета**, Барысаўскага раёна. Першыя сходы прайшлі дрэнна. На сходах прысутнічала не больш 50 проц. выбаршчыкаў. Зусім нязначны ўдзел прымалі жанчыны. На выбарчым участку Дзятлаўшчына са 100 жанчын на сход з'явілася не больш 20.

На час перавыбараў не арганізаваны яслі. У выніку — большая частка жанчын не можа прысутнічаць на сходах. **Справаздачна-перавыбарчыя сходы пачынаюцца несвоечасова і вельмі зацягваюцца.**

Старшыня сельсовета Вілюга свой справаздачны даклад пачаў гадзін у 10 вечара і распягнуў больш як на тры гадзіны. У рэзультаце — да канца даклада асталося ў клубе не больш 30 чалавек, з якіх большасць не справаздачу слухалі, а спакойна спалі на шырокіх лаўках клуба.

У спрэчках амаль ніхто не выступаў, бо выбаршчыкі ледзь дачакаліся канца даклада старшыні сельсовета. Такое-ж становішча наглядалася і на іншых выбарчых участках. **ПРУСАК.**

## ЗЛЁТ МАЛАДЫХ ВЫБАРШЧЫКАЎ

БАРЫСАЎ. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

Сёлета ў Барысаве больш 7 тысяч маладых выбаршчыкаў упершыню будуць прымаць удзел у перавыбарах советаў.

30 кастрычніка райком і горсовет правялі агульна-гарадскі злёт рабочых-маладых выбаршчыкаў. На злёце быў заслуханы даклад старшыні горсовета т. Скакуна аб задачах надыходзячых перавыбараў советаў і ўдзеле ў іх рабочай моладзі. З прамовай выступіў сакратар райкома КП(б)Б тав. Чарнышоў.

**П. Ч.**

## ПРАДВЫБАРНЫ ЗЛЁТ МОЛАДЗІ

БАБРУЙСК.

Нядаўна на лесакамбінаце адбыўся злёт маладых рабочых і работніц, якія ўпершыню ў гэтым годзе прымуць удзел у перавыбарах советаў. На злёт з'явілася 385 чалавек.

У злёце таксама прынялі ўдзел старыя дэпутаты-ўдарнікі, лепшыя ваўтаўцы калбіната, якія перадалі свой вопыт работы ў гарадскім совеце.

**РОЗЕНБЭРГ, ГРЫНШТЭЙН.**

## НА-ХАДУ ВЫПРАВІЦЬ ПАМЫЛКІ

**МАЗЫР, 10 лістапада. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).**

Справаздачная кампанія сельсветаў па раёну ў асноўным закончана. Па чатырох сельсоветах — **Баброўскаму, Бабрынецкаму, Тварычэўскаму і Слабодскаму — ужо праведзены перавыбары.**

Характэрная рыса ўсіх перавыбарчых сходаў — велізарная актыўнасць выбаршчыкаў. На Бабрынецкаму сельсовету яўка выбаршчыкаў на сходы складае 85-90 проц. Па Тварычэўскаму — 95-100 проц. Як правіла, на ўсіх сходах жанчыны складаюць 50-60 проц.

Кожная высунутая на сходзе кандыдатура ў новы склад сельсовета ўсебакова абмяркоўваецца выбаршчыкамі. У дэпутаты выбіраюцца лепшыя калгаснікі-ўдарнікі, адданыя грамадскай рабоце аднаасобнікі і настаўнікі.

Не гледзячы на вялікую актыўнасць у выбарах жанчын, **усё-ж у новым складзе сельсоветаў жанчыны складаюць вельмі нізкі процант.** Так, у склад Бабрынецкага сельсовета, куды выбрана 27 членаў, жанчын увайшло ўсяго 7 — 25.9 проц.; у склад Баброўскага сельсовета выбрана 30 членаў, з іх жанчын толькі 6 — 20 проц.

Тут **сказваецца недаацэнка сельскімі выбарчымі камісіямі грамадскіх здольнасцей жанчын.** У кожным выбарчым участку калгасны актыў звычайна высоўвае на абгаварэнне выбарчага схода не больш адной жаночай кандыдатуры. **Трэба адзначыць, што раённая выбарчая камісія гэтай палітычнай памылкі сельскіх выбарчых камісій не заўважае, і таму ёсць небяспека,** што жанчын будзе выбрана ў сельсоветы вельмі мала.

**Р. ФРАЛОЎ.**

## ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ СТОПРОЦАНТНУЮ ЯЎКУ НА СХОДЫ

КРЫЧАЎ. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

9 лістапада адбыўся раённы злёт маладых выбаршчыкаў. На злёт з'явілася больш 130 чалавек.

Злёт звярнуўся з адозвай да ўсіх маладых выбаршчыкаў раёна, комсамольцаў і піянераў, у якой маладыя выбаршчыкі абавязваюцца забяспечыць 100-процантную яўку на выбарчыя сходы; прасачыць за ўручэннем позваў, падрыхтаваць і ўпрыгожыць памяшканні, дзе будуць праходзіць сходы, праверыць выкананне сельсоветамі наказаў сабраць прапановы для новых наказаў; прывесці ў культурны выгляд усе свае кватэры.

**ВІШНЕЎСКІ.**

# ПАКОНЧЫЦЬ З АБЫВАТАЛЬСКА-БЛАГАДУШНЫМІ АДНОСІНАМІ ДА РАСКРАДВАЛЬНІКАЎ КАЛГАСНАЙ УЛАСНАСЦІ

## АБАРОНЦЫ ЗЛАДЗЕЯЎ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

У калгасе імя Сталіна (Машканскі сельсовет, Віцебскага раёна) на працягу цэлага года не было ніякіх рэвізій. Гэта невыпадкова. У калгасе адкрыта раскрадваецца калгаснае дабро, а праўленне калгаса і рэвізійная камісія пакрываюць злодзеяў.

У грыбкоўскай брыгадзе кладаўшчык **Ф. Л. Янчылін** сістэматычна раскрадвае калгасны хлеб. Гэтай вясной ён разам з брыгадзірам некалькі раз прадаваў жыта і авёс. А потым яны п'янствавалі разам з старшынёй калгаса **Сяменікавым.**

Раскрадванне хлеба прадаўжаецца. Хлеб з новага ўраджаю не запрыходавалі. Ф. Л. Янчыліну дапамагалі ў яго злодзейскіх справах **І. М. Янчылін** і член праўлення калгаса **С. Шпакоў.**

Абраныя калгаснікі пачалі выкрываць злодзеяў. Толькі пасля гэтага праўленне калгаса і рэвізійная камісія зрабілі рэвізію. Выяўлена, што Ф. Л. Янчылін і І. М. Янчылін укралі з калгаснага свірна 952 кгр. аўса, 800 кіло жыта і 37 кіло іншых культур — усяго 1.789 кіло.

Але потым праўленцы і рэвізійная камісія ўсю ноч п'янствавалі разам з выкрытымі злодзеямі. Акт рэвізійнай камісіі нікуды не накіраван. Праўленне калгаса і рэвізійная камісія стараннa замятаюць сляды злачынстваў. **Я.**

## ЧАМУ НАМ НЕ ДАПАМАГЛІ?

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКАЎ)

У калгасе «Рудніца», Сеннепскага раёна, раскрадваецца калгасная маемасць. Старшыня калгаса **Раткевіч** прадаў больш 100 пуд. калгаснай бульбы, а грошы прапіў. Калі рэвізійная камісія хацела зрабіць рэвізію, Раткевіч выгнаў з канцылярыі і касіра, і членаў камісіі.

Хлеб, атрыманы для ільноздатчыкаў, Раткевіч таксама прапівае. Ён, напрыклад, прысвоіў і прапіў 16 кіло хлеба. Кантора «Заготлён» выявіла гэты факт і склала акт. Акт перадалі ў міліцыю, якая замарынавала гэту справу. Пісалі аб гэтым і ў раённую газету «Комунар», але таксама няма ніякіх вынікаў.

У калгасе не хапае 1200 пудоў сена. Шмат сена асталося па віне Раткевіча ў пракосах, а частку ён разбазарыў. Раткевіч, напрыклад, накіраваў два вазы сена нібы на прыёмачны пункт для здачы дзяржаве. На самой-жа справе гэта сена папала на гаспадарку Раткевіча для яго каровы.

Калі пасобныя калгаснікі пачынаюць выкрываць злачынствы Раткевіча, ён пагражае расправай. Так ён за крытыку хацеў выключыць А. Саўгеня з калгаса. А. Саўгень спалохаўся, стаў прасіць Раткевіча і нават даў яму 2 раі пчол і толькі тады старшыня калгаса злітаваўся.

Мы некалькі раз пісалі аб усіх гэтых фактах у раённую газету «Комунар» і палітаддзел Сеннепскай МТС, але ўсё астаецца па-ранейшаму.

**Я. АСТРОЎСКІ, Я. САЎГЕНЬ і інш. усяго 15 подпісаў.**

## НЕЗРАЗУМЕЛАЕ МАЎЧАННЕ БЯГОМЛЬСКАЙ ГАЗЕТЫ І РАЙЗЕМАДДЗЕЛА

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

Старшыня калгаса «Новае жыццё», Бягомльскага раёна, Кармазін падабраў сабе цёплую кампанію, з якою раскрадвае і прапівае калгаснае дабро. У гэту кампанію ўваходзяць члены праўлення Верхаводка Васіль і Владзь, рахункавод Сушкевіч і настаўнік Гайдук. Кожны вечар яны збіраюцца і п'янствуюць у Сушкевіча і конюха Быкоўскага.

Потым ноччу ідуць па вёсцы, хуліганяць, будзяць калгаснікаў. Калі хто ўстане і запытаецца, у чым справа, яго аблаюць і пойдуць далей.

За самакрытыку Кармазін праследуе, пагражае выключэннем з калгаса. Свайго стаўленіка В. Верхаводку, раскрадвальніка калгаснай маемасці, Кармазін зраб'ў бугагдзірам. Па віне Кармазіна і гэтага брыгадзіра загінула частка ўраджаю ільну і зрываюцца ільнозагатоўкі.

Кармазін зрося з кулацкімі элементамі. Кулакоў Дзелянцэвіча і Быкоўскага, выключаных у мінулым годзе з калгаса, Кармазін зрабіў калгаснымі конюхамі. Не дзіва, што ў калгасе гінуць коні. Сам старшыня калгаса загубіў двух коняй. Справа ўжо даўно знаходзіцца ў наркудзе, але аб выніках нічога не чуваць.

Я некалькі раз зварачаўся ў нашу рэённую газету «Калгасны змагар» і райземаддзел, гаворыў аб гэтых фактах, але не атрымаў ніякай дапамогі. З мяне толькі смяюцца.

**А. С. ВЕРХАВОДКА.**

## НЕПАКАРАНЫЯ ЗЛАЧЫНЦЫ

(ПІСЬМО ДЭМАБІЛІЗАВАНАГА ЧЫРВОНААРМЕЙЦА).

Пасля дэмабілізацыі з Чырвонай арміі я прыехаў у калгас імя Варашылава, Сініцкага сельсовета, Бешанковіцкага раёна. І вось што выяўлена.

Летам бягучага года «калгаснік» **Т. П. Бабянкоў**, загадзя дагаварыўшыся з кулачкай **Г. О. Сінкевіч**, якая жыве ў суседняй вёсцы, пачаў красці калгасныя снапы. Усяго Бабянкоў і Сінкевіч укралі каля 300 снапоў. Гэтыя снапы былі знойдзены пры вобыску ў гаспадарцы Сінкевіч.

Да рэволюцыі Бабянкоў разам з бацькам меў 31 дзесяціну зямлі, трымаў батракоў. Пасля прагнаў з калгас і пачаў раскрадваць калгасную маемасць. У мінулым годзе ён разам са сваім братам **Паўлам Бабянковым** (брыгадзір калгаса) укралі 1500 снапоў калгаснага жыта.

Г. О. Сінкевіч увесь час мела кулацкую гаспадарку. Як толькі арганізаваўся калгас, яна пачала раскрадваць калгасную маемасць.

Выязной сесіяй бешанковіцкага наркуда Т. П. Бабянкоў і Г. О. Сінкевіч прытаварваны за раскрадванне калгаснай маемасці да 10 год пазбаўлення волі з высяленнем за межы БССР.

З таго часу **прайшло некалькі месяцаў.** Але Бабянкоў і Сінкевіч па-ранейшаму разгульваюць на волі. Калгаснікі абураны, чаму не пакараны гэтыя злачынцы.

**СІНКЕВІЧ.**

## МЕНСКІ ГОРЗЕМАДДЗЕЛ У РОЛІ НАГЛЯДАЛЬНІКА

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

На адлегласці 10 клм. ад Менска, у Папярнянскім сельсавеце знаходзіцца калгас «Чырвоны ударнік».

Старшынёй калгаса з'яўляецца Васіль Воўк. Зажаўшы самакрытыку, пагражаючы калгаснікам, якія асмеляцца яго крытыкаваць, Воўк робіць усё, што яму ўздумаецца. Ён раскрадвае калгасную маемасць. Калі-ж члены праўлення пачынаюць пратэставаць, Воўк загадвае маўчаць. У кастрычніку, напрыклад, ён самавольна прадаў пародзістага быка з калгаснага стада. Член праўлення М. Сайнук адмовілася выдаць гэтага быка. Воўк абляяў яе апошнімі словамі і сам пашоў у хлеў па быка. А вечарам старшыня калгаса разам з кладаўшчыком Жданам і рахункаводам Сяргеевым арганізавалі папойку. І так Воўк увесь час прадае і прапівае калгаснае дабро. Калгаснікі не ведаюць, колькі намалацілі хлеба і куды ён дзеўся.

Менскі горземаддзел і Папярнянскі сельсавет хоць і ведаюць аб становішчы ў калгасе, але не прымаюць належных мер.

**АТРАШКЕВІЧ, САЙЧУК.**

## НАГУМАЎ РАСЛЕДУЕ...

(ПІСЬМО СЕЛЬКОРА).

**Ігнат Семянец** у мінулым годзе быў жывёлаводам у калгасе імя Леніна (Дабравольчыцкі сельсавет, Парыцкага раёна). За розныя злачынствы Семянец быў выключан з калгаса, а нарсуд асудзіў яго на год прымусовых работ.

Але ў Семянца знайшоўся абаронца ў асобе былога загадчыка парыцкага райземаддзела Бусла. Бусел аднавіў яго ў правах калгасніка і накіраваў на работу ў якасці старшыні калгаса «Трэці рашаючы». Гэта адбылося 1 кастрычніка мінулага года.

Семянец пачаў арудаваць. У калгасе разбазараны кармы, гіне жывёла і забіваюць калгасны маладняк. Семянец пакрывае раскрадвальнікаў калгаснай маемасці. Пётр Галкоў пакраў у калгасе бульбу. Калі калгаснікі былі выкліканы ў суд у якасці сведак.

Семянец іх не пусціў і нават аштрафаваў.

Семянец раздаў кулацкім элементам Багданам Пятру, Аляксею і Іоне па 0,40 га калгаснай зямлі. Кожнаму, хто яго крытыкуе, Семянец пагражае выключэннем з калгаса. Так было зроблена з калгаснікам М. Е. Багданам.

Старшыня калгаса ўсяляк праследуе калгаснік, якія адмаўляюцца ўступіць з ім у палавую сувязь.

Я з'яўляюся селькорам раённай газеты «Ленінская перамога». Тры разы я пісаў аб бясчынствах Семянца. Расследванне заметак было даручана міліцыянеру Навумаву, які расказаў Семянцу аб гэтых заметках і далей справа заглухла.

**С.**

## НА ВАЧАХ У РЭЁННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

Аб тым, што робіцца ў калгасе «Чырвоны земляроб» (Касцянёўскі сельсавет, Лёзненскі раён), добра ведаюць старшыня сельсовета Калатоўкін, агранам МТС Ігнаценка, а таксама і раённыя арганізацыі.

Але аціцісці ў калгасе прадаўжаюцца і па сёмешні дзень. Вось што робіць старшыня калгаса Херувімаў.

Калгаснікі, якія разам са сваімі сем'ямі добрасумленна працавалі на працягу ўсяго года, атрымалі авансам на працадні толькі па 80 кіло жыта. А Херувімаў, які выпрацаваў усяго 62 працадні, атрымаў 200 кіло.

Хлеб ён адвозіць у іншы сельсавет, дзе жыве яго сям'я, якая не хоча працаваць у калгасе. Для сябе Херувімаў бярэ хлеба колькі захоча. Ён моцна пасябраваў з кладаўшчыком К. Туркіным. Разам яны раскрадваюць калгасную маемасць. Так яны прысвоілі ўраджай бульбы з 2 гектараў, рэжуць для сябе калгасную жывёлу і т. д. Туркін і Херувімаў таксама засыпалі для сябе на зіму каля 10 мяшкоў жыта і прысвоілі некалькі мяшкоў ільносемя.

Да кіраўніцтва калгасам прыцягнуты такія людзі, як Журамскі — былы ганціляр і Даліндa — былы цвёрдазаданнік.

Старшыня сельсовета Калатоўкін і агранам МТС Ігнаценка заціскаюць рот кожнаму, хто выкрывае Херувімава. Калгасны актыў пачынаюць цкаваць.

**Ю. Ж.**

## РАСПР ВА ЗА САМАКРЫТЫКУ

Старшыня калгаса «Другая пяцігодка» (Суражскі раён) Г. Шаркоў растраціў 700 руб. калгасных грошай. Кладаўшчык гэтага-ж калгаса **Г. Іванцоў** разбазарыў 40 пудоў калгаснага хлеба. Гэтыя факты былі выяўлены і паведамлены суражскаму земаддзелу. А аб выніках ні слуху, ні духу. Справа была перадана ў суд. І зноў аб выніках нічога не чуваць.

Старшыня калгаса разбазарвае калгасны хлеб, а на выручаныя грошы п'янствуе. Калгасным хлебам ён таксама надзяляе сваіх сваякоў. Вартаўнік М. Іваноў заявіў аб гэтым рэвізійнай камісіі. На Іванова прыкрыкнулі: маўчы, а то аддамо пад суд.

Бацькі Шаркова былі буйнымі кулакамі, мелі 40 га зямлі, 10 кароў і т. д.

Калі я пачаў выкрываць усе гэтыя факты, то мяне выключылі з калгаса.

**Тр. ШАРКОЎ.**

М. ЛЯУКОУ ◆ *Сакратар ЦВК БССР*

# ВЫПРАВІЦЬ НЕДАХОПЫ, З ПОСПЕХАМ ПРАВЕСЦІ ПЕРАВЫБАРЫ

Рашэнне партыі і ўрада аб перавыбарах советаў рабочых, калгаснікі і ўсе працоўныя Совецкай Беларусі сустрэлі з вялікім уздымам, энтузіязмам. Сотні прадпрыемстваў і соўгасаў, тысячы калгасаў уключыліся ў вытворчы паход імя з'ездаў Советаў.

Рабочыя і работніцы, калгаснікі і калгасніцы і ўсе працоўныя адзначылі падрыхтоўку да перавыбараў советаў павышэннем прадукцыйнасці працы, новымі перамогамі ў выкананні вытворчых планаў, у выкананні абавязацельстваў перад дзяржавай і новым магутным прылівам у калгасы.

Скурзавод імя Сталіна ў Магілеве, рэалізуючы ўзятыя абавязацельствы, датэрмінова выконвае промфінплан. Асобныя брыгады завода значна яго перавыконваюць. Так брыгада жыраўшчыкоў дубільнага цэха (брыгадзір тав. **Прысяжны**) забяспечвае выкананне свайго задання на 140 проц.

Перавыконвае промфінплан і фабрыка імя Клары Цэткін (Віцебск).

Гомельская шчацінная фабрыка абвясціла IV квартал ударным.

Бабруйскі лесакамбінат—брыгада тав. Несцера змагаецца за выкананне гадавога плана на 115 проц., за поўнае знішчэнне паломак варш'ята, за поўную ліквідацыю прастояў, максімальнае ўшчыльненне рабочага дня.

Слесар механічнага цэха Віцебскага шчацінага камбіната тав. **Збароўскі** ў падарунак XI з'езду Советаў БССР вынайшоў новую машыну па выцягванню шчаціны па росту і зараз рыхтуе ў падарунак VII усесаюзнаму з'езду советаў новую двух-аўтаматную машыну.

Рабочыя шклозавода «Ільіч» знізілі брак і бой з 13 да 7 проц. і перавыконваюць промфінплан і т. д.

Тысячы перадавых калгасаў дагэрмінова выканалі свае абавязкі перад дзяржавай па хлебапастаўках, бульбапастаўках, па ўдыму зяблева, па мабілізацыі сродкаў, ільнозагатоўках і хлебазакупках.

Дзесяткі тысяч бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія добрасумленна выканалі свае абавязкі перад дзяржавай, зараз уступілі і ўступаюць у калгасы.

Так выказваюць сваю адданасць партыі і советам рабочыя і работніцы, калгаснікі і калгасніцы і ўсе працоўныя.

Аднак, пачатак справаздачна-перавыбарчай кампаніі паказаў, што не ўсе раённыя арганізацыі скарысталі энтузіязм рабочых, калгаснікаў і працоўных для арганізацыі іх на актыўны пагалоўны ўдзел у справаздачна-перавыбарчых сходах.

У першыя дні справаздачна-перавыбарчай кампаніі выявілася, што арганізацыйная работа ў радзе раёнаў значна адстае ад ініцыятывы і актыўнасці мас. Ёсць недаацэнка усяго значэння арганізацыйнай работы з боку партыйных, совецкіх, комсамольскіх і прафесіянальных арганізацый у радзе раёнаў. У рэзультаце—непадрыхтаванасць пасобных советаў да справаздач. Справаздачы на сходах робяцца вельмі доўгімі, агульнымі і адарванымі ад канкрэтнага становішча і задач данага совета. Напрыклад, справаздачны даклад старшыні Пагарэльскага сельсовета, **Асіпавіцкага** раёна, цягнуў я звыш 3-х гадзін. У выніку к канцу схода амаль усе разышліся. Такое-ж самае становішча і ў **Гайнаўскім** сельсавеце, **Лагойскага** раёна. Там таксама к канцу 3-хгадзіннага даклада ўсе разышліся, і спрэчкі прышлося перанесці на другі дзень.

У радзе месц неданупчальна нізкі процант яўкі выбаршчыкаў на сходы і слабая іх актыўнасць (**Тапачынскі, Церахоўскі раёны**). Масавая работа советаў у радзе выпадкаў замяшчаецца. Адсутнічае крытыка недахопаў работы советаў і іх масавых органаў—секцый і дэпутацкіх груп (**Ясенскі сельсовет, Асіпавіцкага раёна, і т. д.**).

Не ўсюды выбаршчыкі даюць ацэнку работы сельсоветаў, дэпутацкіх груп, асобных дэпутатаў па выкананню наказаў і планаў. Больш таго, у пасобных месцах дапушчаны скрыўленні дыяктыў партыі і ўрада аб перавыбарах. Так, па **Рафалаўскаму** сельсовету, **Магілеўскага** раёна, выбары ў **совет скамечаны,** праведзены фармальна з парушэннем інструкцыі.

І зусім правільна зрабіла магілеўская раённая выбарчая камісія, калі адмяніла выбары па гэтаму сельсовету.

Справаздачна-перавыбарчыя сходы ў цэлым радзе раёнаў праводзяцца недапушчальна дрэнна і часта арыгінуцца. У **Блонскім** сельсавеце, **Пухавіцкага** раёна, напрыклад, з-за непадрыхтаванасці совета былі адменены сходы па 8-мі пунктах, а ў **Кнорынскім** сельсавеце—па 3-х пунктах. **По гораду Магілеву таксама былі сарваны справаздачныя сходы па аўтарэмзаводу і шэўковай фабрыцы.**

У радзе месц да складання спісаў пазбаўленых выбарчых праў падышлі фармальна. У спісы ліш[illegible] дакументальнымі данымі. У **Лёзненскім** раёне па рашэнню советаў **несвоечасова** былі вывешаны спісы пазбаўленых выбарчых праў. У гэтым-жа раёне зашесцы ў спіс пазбаўленых выбарчых праў калгаснікі, якія на працягу ўжо пяці год працуюць у калгасах, а сыны іх знаходзяцца ў Чырвонай арміі. У **Прутнаўскім**-жа і **Жгунабудскім** сельсоветах, **Гомельскага** раёна, спісы пазбаўленых выбарчых праў нават зусім не вывешваліся.

У радзе раёнаў партыйныя і совецкія арганізацыі не надаюць належнай увагі падбору рэкамендуемых кандыдатур у советы. Узорыкам, ілюструючым безадказны, фармальны адносіны да гэтай важнейшай справы, з'яўляюцца **Беркалабаўскі** сельсовет, **Быхаўскага** раёна. **Там умудрыліся** зашесці ў спіс **для рэкамендацыі ў новы склад совета.** На Беркалабаўскаму выбарчаму ўчастку **Бекаеўскага** Нятра, 60 год псыхічнахворага і **Барсукова Фядота**, які па-60 год. **Барсукова Фядота, які... па** мёр 15 год таму назад. Характэрна, што рэкамендавалі і выставілі гэты спіс, упоўнаважаны Р[illegible] **Дземіновіч,** старшыня сельсовета і партгрупа. Гэты факт інакш нельга растлумачыць, як палітычную слепату.

Цэнтральная выбарчая камісія за палітычную слепату і блізарукасць распушчана **Бярэзалабаўская** выбарчая камісія. Вінаватыя прыцягнуты па партыйнай лініі да адказнасці.

З гэтага факта ўсе партыйныя і совецкія арганізацыі павінны зрабіць адпаведны вывад.

У радзе месц вельмі дрэнна стаіць справа з падборам кандыдатур жанчын у советы. Больш таго, ёсць недаацэнка гэтага пытання нават з боку старшынь РВК. Старшыня Любаньскага РВК так. **Падліпскі** на запытанне, што робіцца па выяўленню кандыдатур жанчын для высоўвання іх у советы ў якасці старшынь адказаў: «У нас няма адпаведных кандыдатур, і мы не маем зараз магчымасці вылучыць жанчын у советы ў якасці старшынь». Такое-ж становішча і па **Кармянскаму, Горацкаму** і інш. раёнах.

Не складзена адпаведная абстаноўка і для правядзення самых справаздачна-перавыбарчых сходаў у радзе сельсоветаў. Памяшканні не падабраны, не ўпрыгожаны лозунгамі, дыяграмамі (**Сопацінскі** сельсовет — **Магілеўскага** раёна. **Пагарэльскі** сельсовет — **Асіпавіцкага** раёна і т. д.)

Па раду раённай справаздачна-перавыбарчая кампанія советаў слаба ўвязваецца з вырашэннем гаспадарча-палітычных задач і асабліва з закупкай хлеба (**Жлобінскі, Чырвонапольскі** і іншыя раёны).

Усё гэта з'яўляецца вынікам дрэннай работы раду советаў, РВК, раённых выбарчых камісій, якія замест канкрэтнага, аператыўнага кіраўніцтва па арганізацыі справаздачна-перавыбарчых сходаў палажыліся на самацёк, перадаверылі гэту справу сельскім і местачковым выбарчым камісіям.

Справаздачна-перавыбарчыя сходы неабходна ўсямерна выкарыстаць для таго, каб «падняць аўтарытэт выбаршчыка, як крыніцу ўлады дэпутата, як правадніка яе волі, і совета, як калектыўнага выразніцеля волі сваіх выбаршчыкаў».

***

Правалімая падрыхтоўка да справаздачна-перавыбарчай кампаніі выклікала шалёнае супраціўленне астаткаў недабітага класавага ворага.

У **Стара-Запружскім** сельсавеце, **Веткаўскага** раёна, кулацкія элементы сарвалі вывешаны спіс лішэнцаў. У **Палажэвіцкім** сельсавеце, **Магілеўскага** раёна, на адным выбарчым участку была ўкрадзена газа з мэтай арыгінуцца справаздачнага схода. У **Хатаўнянскім** сельсавеце, **Кармянскага** раёна, класавым ворагам былі распушчаны чуткі, што на выбарчыя позвы будзе спаганяцца плата па 7 руб.

У Кармянскім раёне рукамі класавага ворага падпалена хата актывіста **Мурашкі.** У **Хляўнянскім** сельсавеце падпалена хата старшыні калгаса, аднаго з лепшых актывістаў сельсовета, аддана прапаваўшага па загатоўках сельгаспродукцыі.

У Чэрыкаўскім раёне перад пачаткам выбараў у советы выключана з калгаса «Пабеда», Алерыцкага сельсовета, без усякіх падстаў адна з лепшых совецкіх актывістак—член сельсовета Палякова.

Гэтыя факты сведчаць аб тым, што класава-варожыя элементы апрача тэрарыстычных актаў шукаюць усе спробы, каб скампрэметаваць, вывесці з советаў актыўных, чесных работнікаў, каб скампрэметаваць у цэлым совет (зараз Палякова ў калгасе адноўлена).

Гэта сведчыць аб тым, што трэба максімальна ўзмацніць класавую большэвіцкую пільнасць усіх арганізацый і ўсіх працоўных, пазбягаючы і выкрываючы вылазкі класавага ворага, даючы ім знішчальны адпор.

Моцна згуртаваўшыся вакол ленінскай партыі і любімага правадыра партыі і сусветнага пролетарыята таварыша Сталіна, выбарам советы, якія на справе будуць правадніка генеральнай лініі партыі, якія забяспечаць выкананне пятгадовых задач другой пяцігодкі — пяцігодкі пабудовы бясклассавага сацыялістычнага грамадства.

# УЗМАЦНЕННЕ ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ Ў МАНЧЖУРЫІ

ШАНХАЙ, 8 лістапада. (БЕЛТА). Харбінскі карэспандэнт «Норд чайна дэйлі ньюс» піша, што на берагах Усуры арганізаваўся атрад паўстанцаў колькасцю да 10 тысяч чалавек, які стварыў там рэспубліку, мае гарматы і ўзбраенне, дастатковыя, каб адбіваць атакі рэгулярных войск. Атрад прадстаўляе сабой злучаныя сілы тых, хто апошнія 3 гады вядзе барацьбу ў Манчжурыі і падняў мяцяжы ў вайсковых часцях Манчжоў-Го, якія далучыліся да іх. Супроць атрада адпраўлена вялікая ваенная экспедыцыя, якая мае аэрапланы.

«Джунхуажыбао» паведамляе, што каля 3 тыс. сялян з раёнаў, размешчаных у верхнім цячэнні ракі Ялу, якія былі сагнаны з іх зямлі японцамі для пабудовы там дарог, далучыліся да паўстанцаў.

«Сіньвэньбао» піша аб актывізацыі карэйскай арміі, незалежнасці якая аперуе ў раёнах Тунхуа, Хенчжэн, Сіньцін, ва ўсходняй Манчжурыі, дзе, не гледзячы на праследванні з боку японцаў, карэйскае насельніцтва яе падтрымлівае.

«Цэнтраль ньюс эджэнсі» паведамляе аб значнай канцэнтрацыі паўстанцаў у раёнах Саньсін, Нінгута ва ўсходняй частцы Гірынскай правінцыі, а таксама аб аперацыях атрада паўстанцаў у 1000 чалавек у раёне Фынін.

Як паведамляецца, ваенны міністр Манчжоў-Го асабіста кіруе аперацыямі па ліквідацыі дзейнасці паўстанцаў. Паводле паведамлення агенцтва «Сімбун рэнго», каля 300 «бандытаў» атакавалі Лалагоў каля Ліньцзяна на граніцы з Карэяй.

«Міньбао» паведамляе, што ў раёне Шуаньшыня ва ўсходняй частцы Гірынскай правінцыі з вялікімі стратамі для абодвух бакоў адбываюцца баі паміж паўстанцамі і японскімі атрадамі.

Паводле паведамлення «Шуньбао» атрады манчжурскіх войск каля Даянцзыкоў (на поўнач ад Тунхуа ва ўсходняй частцы Гірынскай правінцыі) нясуць цяжкія паражэнні.

«Джунхуажыбао» паведамляе, што больш двух тысяч паўстанцаў аперуюць удоўж Лафа-Харбінскай чыгункі, перарываючы эшэпы.

Як паведамляе «Шуньбао», 500 паўстанцаў з'явіліся на ўчастку паміж Цзінсі і Суйчжунам на Муклен-Шанхайгуаньскай чыгунцы, куды пасланы японскія войскі.

ТОКІО, 5 лістапада. (БЕЛТА). Карэспандэнт агенцтва «Ніці-ніці» з Харбіна паведамляе, што японскі атрад у бай з атрадам «бандытаў» у 1000 чалавек 5 лістапада каля Сіндэна (на паўднёвы ўсход ад Харбіна) страціў 12 чалавек забітымі і 9 раненымі.

# КАТАРЖНЫЯ ПРЫГАВОРЫ РАБОЧЫМ У ГЕРМАНІІ

БЕРЛІН, 8 лістапада. (БЕЛТА). У Берліне і Эссене закончыліся 8 лістапада два працэсы рабочых, абвінавачаных у прыналежнасці да компартыі. Берлінскі суд разгледзеў справу 42 рабочых, абвінавачаных у стварэнні нелегальнай арганізацыі КПГ у берлінскіх раёнах Ліхтэнберг і Штраляў. 6 галоўных абвінавачаных прыгавораны да 14 год катаргі, астатнія на розныя тэрміны турмы.

На працэсе ў Эссене абвінавачаліся ў падрыхтоўцы к звяржэнню існуючага ладу 51 чалавек. У вогуле абвінавачаныя прыгавораны да 52 гадоў турмы і 15 год катаргі.

ПАДАГРАВАННЕ ДУХУ СТАРОЙ САМУРАЙСКАЙ ЯПОНІІ. На здымку: Урачыстая працэсія з удзелам школьнікаў у старынных аблачэннях у часе свята ў Токіо.

# ПЛЕНУМ ЦК КОМПАРТЫІ ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 8 лістапада. (БЕЛТА). Як паведамляе «Юманіта», першага і другога лістапада адбыўся пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Францыі. Асноўнай задачай пленума была распрацоўка мер барацьбы супроць пагрозы фашызма і вызначэнне шляхоў стварэння шырокага адзінага фронта, здольнага аб'яднаць усе антыфашысцкія сілы краіны.

Пленум ухваліў даклад Торэза, прадставіўшага праграму барацьбы за непасрэдныя патрабаванні рабочых і сялян.

Пленум заслухаў даклад Андрэ Марці аб падзеях у Іспаніі і пацвердзіў у прынятай рэзалюцыі салідарнасць французскіх прапоўных з гераічнымі барацьбітамі Астурыі.

# ВІЗІТ ГЕРМАНСКАГА ПАСЛА САЙМОНУ

ЛОНДАН, 9 лістапада. (БЕЛТА). Германскі пасол Геш паведаў міністра замежных спраў Англіі Саймона. Геш заявіў, што пасылка французскіх войск у Саарскую вобласць «непрымальна» для Германіі.

Згодна атрыманых вестак, старшыня адміністрацыйнай камісіі Саарскай вобласці Нокс зноў звярнуўся з просьбай аб умацаванні паліцыі ў Саары.

# РОСПУСК САЮЗА ПРОЛЕТАРСКІХ БЯЗБОЖНІКАЎ У ЧЭХАСЛАВАКІІ

ПРАГА, 9 лістапада. (БелТА). Па распараджэнню міністэрства ўнутраных спраў, распушчан саюз пролетарскіх бязбожнікаў як у Празе, так і па ўсёй Чэхаславакіі.

# ГЕРАІЧНЫ НАЛЁТ АСТУРЫЙСКІХ ГАРНЯКОЎ НА АРСЕНАЛ У ОВІЕДО

ЛОНДАН, 9 лістапада. (БЕЛТА). Як паведамляе «Дэйлі уоркер», гарнякі ў Астурыі прарваліся праз кальцо ўрадавых войск вакол Овіедо, праніклі ў горад і накіраваліся да цэнтральнага арсенала. Захапіўшы 11 тысяч вінтовак і вялікую колькасць амуніцыі, гарнякі ўйшлі. «Уся Іспанія, — піша газета, — узбуджана паведамленнем аб налёце на арсенал у Овіедо. Рашчоўны націск і энергічнасць яго прывялі ў замяшанне ўрад».

# ПРАТЭСТ СУПРОЦЬ РАСТРЭЛУ РЭВОЛЮЦЫЯНЕРАЎ У ІСПАНІІ

ПАРЫЖ, 9 лістапада. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Мадрыда, расстрэлены два рэволюцыянеры, смяротныя прыгавары якім былі зацверджаны ўрадам.

Віднейшыя французскія пісьменнікі — Анры Барбюс і Рамэн Ралан адправілі ад імя міжнароднага камітэта па барацьбе з фашызмам і вайной кіраўніку іспанскага ўрада Лерусу пратэст супроць кары смерцю двух рэволюцыянераў.

# БЕНЕШ АБ МІЖНАРОДНЫМ СТАНОВІШЧЫ

ПРАГА, 8 лістапада. (БелТА). Як паведамляе чэхаславацкае тэлеграфнае агенцтва, міністр замежных спраў Бенеш выступіў 6 лістапада на пасяджэнні абодвух палат па пытаннях знешняй палітыкі. У сваім выступленні Бенеш спыніўся на ўступленні СССР у Лігу нацый, падкрэсліўшы, што ўступленне СССР у Лігу нацый іменна ў цяперашніх абставінах мае вялікае значэнне і па сутнасці, з пункту гледжання далейшага развіцця міжнароднай палітыкі, гэта азначае змяненне ў еўрапейскай абстаноўцы. З гэтага змянення — адзначыў Бенеш — Чэхаславакія робіць адпаведныя вывады. Палітыка збліжэння паміж Чэхаславакіяй і СССР прасоўваецца нармальна наперад, і ў недалёкім часе, напэўна, будзе падпісан гандлёвы дагавор і будзе заманавана гаспадарча-палітычнае супрацоўніцтва ў справе захавання міру.

Міжнароднае становішча Бенеш характарызуе, як становішча ўзаемнага чакання і фармавання новых сіл і франтоў. Міжнароднае становішча, паводле слоў Бенеша, сур'ёзнае і ўсякая больш значная падзея можа выклікаць патрасенне.

Бенеш думае, што бліжэйшы год з'явіцца рашаючым для лёсу міру ў Еўропе, і таму Чэхаславакія павінна быць падрыхтавана да ўсякіх магчымасцей.

*Морскія перагаворы ў тупіку*

# НЯЎДАЧНЫ МАНЕЎР АНГЛІІ

ЛОНДАН, 8 лістапада. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, Англія з мэтай вывесці з тупіка морскія перагаворы ў Лондане прапанавала прадставіць Японіі ў прынцыпе роўнапраўе ў морскіх узбраеннях, не заключаць ніякага звязваючага дагавора, прычым кожная краіна павінна паведаміць другія краіны аб намечанай ёй максімальнай праграме морскага будаўніцтва. Гэта прапанова спаткана адмоўна ў Японіі і ў амерыканскіх колах. На агульную думку, Японія і ЗША астаюцца цвёрда на сваіх першапачатковых пазіцыях.

# СПРАВА АБ БАНДЫЦКІМ НАПАДЗЕ НА ШХУНУ „ЕВГЕНИЯ" І УГОНЕ ЗА ГРАНІЦУ КАТЭРА „Ж-17"

9 лістапада 1934 года ва Владзівастоку выязная сесія ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза пад старшынствам тав. Рычкова і з удзелам дзяржаўнага абвінаваўцы пам. пракурора Саюза тав. Гродко і абаронцаў тт. Медведкова і Палянскага была разгледжана справа па абвінавачанню Борушко, Бессолава, Бокава, Сінева, Бузевіча, Бернадскага, Александрава, Тітарэнка ў злачынстве, прадугледжаным арт. 59—3 К. к. РСФСР (бандытызм).

Сутнасць справы заключаецца ў наступным: у снежані 1932 года ва Владзівастоку, пад кіраўніцтвам Бессолава і Борушка, была арганізавана бандыцкая шайка, захапіўшая 12 жніўня г. г. шляхам узброенага нападу катэр Дальдзяржрыбтрэста «Ж-17» і ўгнаўшая яго за граніцу. У склад шайкі, апрача Бессолава і Борушка, уваходзілі таксама пералічаныя вышэй асобы, пры чым Тітарэнка і Александраў зрабілі ў мінулым рад крымінальных злачынстваў (атрабленне склада, замах на атрабленне кладовай больніцы і інш.).

Судом было ўстаноўлена, што гэта шайка загадзя размеркавала паміж удзельнікамі абавязкі, правёўшы папярэднюю падрыхтоўку гэтага бандыцкага злачынства.

11 жніўня 1934 г., атрымаўшы на значэнне весці на буксіры двухмачтавую маторна-парусную шхуну «Евгения» з гаручым на промысел Зарубіна, Бессолаў і Борушка, выконваўшы абавязкі памочніка капітана катэра «Ж-17», рашылі скарыстаць гэтай рэйс для ажыццяўлення сваіх злачынных замыслаў.

У ноч на 12 жніўня, прышвартаваўшыся да шхуны «Евгения» і папярэдне забіўшы прысутнага на катэры матроса Аргал, які здаваўся гэтай бандзе небяспечным, бандыты ограбілі і захапілі шхуну. У часе гэтага нападу былі забіты памочнік механіка шхуны «Евгения» Ефіменка і хлопчык 12 год Нікалай Рабаў, брат памочніка капітана той-жа шхуны, і ранены сам Рабаў і матрос Турханаў. Затапіўшы шхуну, катэр узяў курс на Шанхай.

Аднак, пасля прыбыцця ў Шанхай, усе ўдзельнікі гэтага злачынства былі затрыманы кітайскімі ўладамі і па патрабаванню савецкіх улад перададзены ў распараджэнне савецкіх судовых органаў.

Ваенная Калегія Вярхоўнага суда пастанавіла: Борушка, Бессолава, Бокава, Сінева, Бузевіча, Бернацкага — першых двух, як арганізатараў, а астатніх як актыўных удзельнікаў гэтага бандыцкага злачынства — да вышэйшай меры крымінальнага пакарання — расстрэлу з канфіскацыяй усёй асабіста належачай им маемасці. Тітарэнка, непасрэдна не прымаўшага ўдзелу ў захопе катэра — да пазбаўлення волі тэрмінам на 10 год з канфіскацыяй маемасці і Александрава — да 5 год пазбаўлення волі і з паражэннем у правах на 3 гады.

(БЕЛТА).

# БАЛАНС

## Беларускага рэспубліканскага трэста кандзіцерскай, макароннай і крухмальнай прамысловасці „БЕЛКМО"

### на 1-е студзеня 1934 г. і параўнанне яго з данымі бухгалтарскага баланса 1933 г.

| АКТЫЎ: (Склад і размеркаванне сродкаў) | СУМА: На 1-1—1933 г. | На 1-1—1934 г. |
|---|---|---|
| **I. Асноўныя сродкі** | | |
| 1. Будынкі і будаўлі вытворч. | 8146240—01 | 9249458—25 |
| 2. Невытворчага і спажывецкага значэння | 531916—28 | 597003—30 |
| Усяго па I раздзелу | 8678156—29 | 9846461—55 |
| **II. Вытворчыя запасы на складзе і ў пуці** | | |
| 1. Сыравіна, асноўн. і дапаможн. матэрыялы, тара | 2698427—43 | 6464006—88 |
| 2. Паліва | 127096—23 | 113188—26 |
| 3. Запасныя часткі, малацэнны інвентар і інструменты | 88236—96 | 116132—68 |
| 4. Нескончаныя загатоўкі | 155085—81 | 228699—05 |
| 5. Маладняк жывёл | 387 70 | 858—39 |
| Усяго па II раздзелу | 3064234—13 | 6922885—26 |
| **III. Нескончаная прадукцыя:** | | |
| 1. Астаткі незавершан. вытворч. і паўфабрыкаты | 1212787—39 | 393732—48 |
| Усяго па III раздзелу | 1212787—39 | 393732—48 |
| **IV. Таварныя запасы:** | | |
| 1. Тавары на складзе і ў пуці | 737568—13 | 2009897—13 |
| 2. Тавары ў рознічных прадпрыемствах | 5589—52 | 223321—43 |
| 3. Тавары, адгружаныя і неаплочан. | 1247656—49 | 1839636—64 |
| 4. Тавары, адгружаныя прадпрыемствам свайго трэста | 69734—50 | 96465—80 |
| Усяго па IV раздзелу | 2060548—64 | 4169321—00 |
| 5. Матэрыялы і інвентар выдзелен для рэалізацыі | 14202—39 | 47671—11 |
| **VI. Грашовыя сродкі.** | | |
| 1. Каса, грашовыя дакументы і пераводы | 19244—29 | 61525—87 |
| 2. Разліковыя, бягучыя і асобныя рахункі ў крэдытных установах | 1135055—06 | 503364—56 |
| 3. Акрэдытывы | 61395—75 | 242724—28 |
| 4. Бягучы рахунак ФЭБ | 6182—79 | — |
| Усяго па VI раздзелу | 1221877—89 | 807614—71 |
| **VII. Сродкі ў разліках** | | |
| 1. Дэбіторы абагуленага сектара | 368086—70 | 207526—79 |
| 2. НКФ па падатках і зборах | — | 814026—31 |
| 3. Дэбіторы не абагулен. сектара | 3015—79 | 2860—44 |
| 4. Справаздачныя сумы | 75591—56 | 29405—82 |
| 5. Рабочыя і служачыя | 34870—52 | 12047—74 |
| 6. Няпэўныя даўгі | 72664—87 | 49548—48 |
| 7. Выдаткі будучых гадоў | 55153—42 | 65449—01 |
| Усяго па VII раздзелу | 609382—86 | 1180664—59 |
| **VIII. Выдзеленыя сродкі** | | |
| 1. НКФ па адлічэннях з прыбытку | 2218413—81 | 2678000—00 |
| 2. Узносы ў Промбанк | 1450000—00 | 636790—46 |
| 3. Уклады ў ЦК банк | 802594—92 | 992594—92 |
| 4. Уклады ў іншыя арганізацыі | 220077—47 | 217954—92 |
| 5. Пазыкі ЗРК | 130357—99 | 189559—12 |

| ПРАЦЯГ АКТЫВА | СУМА: На 1-1—1933 г. | На 1-1—1934 г. |
|---|---|---|
| 6. Паі, акцыі і каштоўныя паперы | 59745—97 | 27675—00 |
| Усяго па VIII раздзелу | 4881190—16 | 4742574—42 |
| **IX. Унутраныя разлікі** | | |
| 1. Разлікі з будаўніцтвам: | | |
| а) па разліках, якія не падлягаюць звароту | — | 548530—34 |
| б) па разліках, падлягаючых звароту | — | 33234—65 |
| Усяго па IX раздзелу | — | 581764—99 |
| БАЛАНС | 21742379—75 | 28692690—11 |
| **ПАСІЎ** | | |
| **I. Унутраныя рэсурсы** | | |
| 1. Статутны фонд | 10298682—51 | 11690860—12 |
| 2. Амартызацыйны фонд | 866289—00 | 1167711—19 |
| 3. Спецыяльныя фонды: | | |
| а) фубр | 979277—58 | 1175326—38 |
| б) іншыя | 24687—43 | 48864—10 |
| 4. Матавыя рэзервы | 99099—91 | 109089—18 |
| Усяго па I раздзелу | 12268036—43 | 14191350—97 |
| **II. Рэгулюючыя арт.** | | |
| 1. Розніца паміж разлік. цаной і заводскім сабекоштам на астатак гатовых вырабаў | 75326—07 | 183818—36 |
| 2. Накладанні на тавары ў рознічных прадпрыемствах | 1302—71 | 10517—24 |
| 3. Непагаш. узнос. асноўных сродкаў (на 1.X. 1925 г.) | 314993—33 | 314993—33 |
| Усяго па II раздзелу | 391622—11 | 509329—53 |
| **III. Прыцягнутыя сродкі:** | | |
| 1. Доўгатэрміновыя крэдыты | 1170824—35 | 473429—98 |
| 2. Кароткатэрміновыя пазыкі крэдытных устаноў | 2264305—57 | 5769992—90 |
| 3. Крэдыторы абагуленага сектара | 935823—80 | 1974232—81 |
| 4. НКФ па падатках і зборах | 1373107—05 | 1828888—05 |
| 5. Крэдыторы неабагуленага сектара | 147719—72 | 88056—98 |
| 6. Рабочыя і служачыя па зарплаце | 216203—44 | 170579—35 |
| Усяго па III раздзелу | 6107983—93 | 10305179—99 |
| **IV Накапленне (прыбытак)** | | |
| 1. За справаздачны перыяд | 2974737—28 | 3686829—62 |
| Усяго па IV раздзелу | 2974737—28 | 3686829—62 |
| БАЛАНС | 21742379—75 | 28692690—11 |

**СТРАТЫ. РЭЗУЛЬТАТЫ ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЗА 1933 г. ПРЫБЫТКІ**

| СТРАТЫ | |
|---|---|
| 1. Страты ад аперацый з тарай | 267679—00 |
| 2. Страты ад ліквідацыі асноўн. сродкаў | 31798—49 |
| 3. Утрымане кансервав. прадук. | 5263—66 |
| 4. Страты ад асваення вытворч. новых заводаў на працягу прадугледж. планам перыяда | 11295—06 |
| 5. Страты ад спісання даўгоў з-за сканчэння тэрмінаў іскавой даўнасці і безнадзейных даўгоў. | 112742—26 |
| 6. Адлічэнні ў рэзерв няпэўных даўгоў | 55301—98 |
| 7. Страты па аперацыях мінулых гадоў | 136959—44 |
| 8. Іншыя страты | 128370—15 |
| УСЯГО | 749410—04 |
| Чысты прыбытак | 3686829—62 |
| УСЯГО | 4436239—66 |

| ПРЫБЫТКІ | |
|---|---|
| 1. Прыбытак ад рэалізацыі | 4007316—45 |
| 2. Прыбытак ад арэндных арт. | 4039—66 |
| 3. Прыбытак па безнадзейных даўгах і ад зніжэння крэдыторскай запазычанасці з-за сканчэння тэрмінаў іскавой даўнасці | 177551—90 |
| 4. Прыбытак ад пералічэння нескарыстаных рэзерваў | 46514—88 |
| 5. Іншыя прыбыткі | 200894—77 |
| УСЯГО | 4436239—66 |

Нам. дырэктара трэста «БЕЛКМО» **МЕДЫНАК.**
Нам. галоўнага бухгалтара **А. ЛЯХАВІЦКІ.**

# АБ СКЛІКАННІ ЗЛЁТА ЗАВОЧНІКАЎ ПАРТЫЙНАЙ ВУЧОБЫ

*Пастанова Бюро Менгаркома КП(б)Б*

1. Склікаць злёт завочнікаў партыйнай вучобы па гор. Менску 13 лістапада ў 19 гадз. у Доме партактыва, з парадкам дня:

а) Задачы завочнага партыйнага навучання і становішча па Менскаму раёну.

Даклядчык заг. аддзела культуры і прапаганды ленінізма ГК тав. Варончанка.

б) Даклады сакратароў парткомаў аб разгортванні і ходзе завочнага партнавучання (сакратар парткома НКЮ тав. Бязборда, СНК тав. Ганчарова і НКВД тав. Оберфельда).

в) Аб соцспаборніцтве.

2. Абавязаць усіх сакратароў партакомаў і парторгаў з'явіцца на злёт разам з сваімі завочнікамі.

3. Па раёну склікаць злёт завочнікаў партыйнай вучобы 21 лістапада ў 4 гадзіны дня з тым-жа парадкам дня, што і па гораду.

4. Даручыць газетам «Рабочий», «Звязда» і «Окцябр» шырока папулярызаваць ход завочнай партвучобы ў друку.

Сакратар Менгаркома КП(б)Б РЫСКІН.

# УСІМ ПАРТЫЙНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ

Меркарком КП(б)Б рэкамендуе на чарговым партыйным дні паставіць пытанне аб ходзе падрыхтоўкі да перавыбараў горсавета, на якім абгаварыць палітычныя задачы камуністаў і комсамольцаў на перавыбарах, канкрэтны план перавыбараў, аб дапамозе шэфскім арганізацыям па перавыбарах сельсоветаў і абмеркаваць кандыдатуры намечаных у гарадскі совет.

Асаблівую ўвагу партарганізацыі павінны згярнуць на добрую падрыхтоўку партдня з тым, каб правесці яго найбольш дзеладіта, на высокім палітычным узроўні ў адпаведнасці з дырэктывамі партыі і ўрада аб перавыбарах совецтаў.

Нам. сакратара Менгаркома КП(б)Б ХАДАСЕВІЧ.

# АБ РЭАРГАНІЗАЦЫІ НОВА-МАЛЫНІЦКАГА НАЦЫЯНАЛЬНА-ПОЛЬСКАГА СЕЛЬСОВЕТА І АБ ЛІКВІДАЦЫІ ПАДОСАЎСКАГА І РУДНЕ-НІСІМКАВІЦКАГА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ПОЛЬСКІХ СЕЛЬСОВЕТАЎ ЧАЧЭРСКАГА РАЁНА

*Пастанова Прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Беларускай ССР*

У сувязі з тым, што дэтальным абследваннем устаноўлена, што Нова-Малыніцкі, Рудне-Нісімкавіцкі і Падосаўскі нацыянальныя польскія сельсоветы, Чачэрскага раёна, складаюцца ў пераважнай большасці з беларускага насельніцтва, уся работа ў гэтых советах праводзіцца на беларускай мове і што насельніцтва польскай мовы не ведае. Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР пастанаўляе:

1. Рэарганізаваць Нова-Малыніцкі нацыянал-польскі сельскі совет у беларускі, без змены яго тэрыторыі.

2. Падосаўскі і Рудне-Нісімкавіцкі нацыянальныя польскія советы ліквідаваць, далучыўшы тэрыторыю Падосаўскага совета да Покацкага і Рудне-Нісімкавіцкага—да Нісімкавіцкага сельсовета.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯЎКОЎ.

29 кастрычніка 1934 г.

# АБ ДАПАУНЕННІ ПАСТАНОВЫ „АБ АПЛАЦЕ ЖЫЛЫХ ПАМЯШКАННЯЎ У ГАРАДАХ, МЯСТЭЧКАХ, РАЁНЫХ ЦЭНТРАХ І РАБОЧЫХ ПАСЕЛКАХ" арт. 15-а

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

Дапоўніць пастанову ЦВК і СНК БССР «Аб аплаце жылых памяшканняў у гарадах, мястэчках, раённых цэнтрах і рабочых пасёлках (З. З. БССР 1934 г., № 24, паст. 117) арт. 15-а ў наступнай рэдакцыі:

«15-а. Для рабочых і малодшага начальніцкага складу прафесіянальных пажарных каманд устанавіць скідку ў размеры 15 проц. з асноўнай стаўкі кватэрнай платы».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Нам. старшыні Совета Народных Камісараў БССР А. СААК'ЯН.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯЎКОЎ.

4 лістапада 1934 г.

# ПРЫЁМ У КІРАЎНІЦТВЕ УПАЎНАВАЖАНАГА НКЗС

8-га лістапада 1934 г., з прычыны 17-й гадавіны Окцябрскай рэволюцыі, у кіраўніцтве ўпаўнаважанага НК замежных спраў адбыўся прыём, у якім прымалі ўдзел: упаўнаркомзамежных спраў т. Карташоў, наркомасветы Чарнушэвіч, нарком мясцовай прамысловасці Бацін, старшыня Менскага горсовета Жуковіч, кіраўнік спраў СНК Шабалтас і другія члены ўрада.

На прыёме прысутнічаў склад польскага генеральнага консульства ў Менску на чале з генконсулам п. Яцавецкім.

# ПАБУДУЕМ АГІТЗВЯНО ІМЯ III УСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДА РАБСЕЛКОРАЎ

* Рэдакцыя насценгазеты віцебскага горсовета ўнесла на пабудову агітзвяна 170 рублёў, рэдакцыя шматтыражкі «Першы ўдарнік» лесазавода імя «Правды»—100 рублёў.

ПІМШТЭЙН.

* Рэдакцыя «Палескай праўды» на пабудову агітзвяна ўносіць 1.073 руб. Збор сродкаў працаўжаецца.

«Палеская праўда»—ШЛЕЙФМАН.

* Калектыў работнікаў рэдакцыі брагінскай раённай газеты «Трыбуна калгасніка», селькоры і члены рэдкалегіі насценгазет калгасаў «Надзея» і «Інтэрнацыянал» і калгаснікі-ўдарнікі ўносяць на пабудову агітзвяна 321 руб. 83 кап.

Рэдактар газеты «Т. К.» ПЕЦЯРЭНКА.

# ПАПРАЎКІ

У артыкуле тав. К. Ратнека, які надрукаван у «Звязде» ад 10 лістапада, у канцы чацвертай калонкі пераблытан выраз. Надрукавана: «Толькі за апошні час работа большасці палітаддзелаў сярод аднаасобнікаў прыкметна пагоршылася». Павінна быць: «... прыкметна палепшылася».

У пастанове камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласцю, надрукаванай у «Звязде» ад 10 лістапада, па Любаньскаму раёну памылкова ўказана па адставанне ў хлебапастаўках. Трэба чытаць у хлебазакупках.

Рэдакцыя, партком і калектыў работнікаў рэдакцыі «Звязда» выказваюць шчырую падзяку заслужанаму артысту В. М. Владамірскаму, актораам Л. П. Александроўскай, Е. В. Замешынай, М. Альтман, кампазітару Цікоцкаму і вакальнаму квартэту ў складзе актораў Пігулеўскага, Нікалаевіча, Пуроўскага, Швайко, Марц'янаву, Кулагіну і Жэмеру, прыняўшым удзел у канцэрце на ок цябрскім вечары ў рэдакцыі.

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

# ЗАГАД

## па менскаму ГарАНА ад 5 лістапада 1934 г.

Асобнымі школамі г. Менска ігнаравана распараджэнне гарана ў частцы арганізаванага паходу вучняў школ у кіно, тэатры.

2-XI—34 г. у часе наведвання пастаноўкі операнага тэатра вучні школы 31, 17, 2 з'явіліся без па-зашкольных работнікаў і настаўнікаў (па 2-й школе адсутнічаў па-зашкольны работнік), у выніку чаго вучні гэтых школ перашкаджалі ходу пастаноўкі, кідалі паперай, лушчылі семечкі і інш.

Выходжачы з адначанага, па-зашкольнага работніка 31-й школы ФЕЛЬДМАНА з работы зняць; дырэктару гэтай школы т. МІХАЛКОВІЧУ за парушэнне загада гарана аб арганізаваных паходах у кіно-тэатры і самавольны прыём на па-зашкольную работу т. ФЕЛЬДМАНА абвясціць вымову з занясеннем у ўпрацоўны спіс.

Па-зашкольнаму работніку 17-й школы т. БАРКАН абвясціць вымову з занясеннем у працоўны спіс.

Дырэктарам школ 20-й т. САБ'ЛЕЎСКАМУ і 7-й т. ГАРАДЗЕЦКАМУ за арганізаваны паход у кіно-тэатр, добрыя паводзіны вучняў у часе ходу пастаноўкі і арганізаваны зварот вучняў з тэатра абвясціць падзяку.

Катэгарычна прапаную наведвание кіно-тэатраў вучнямі школ, праводзіць арганізавана з абавязковай прысутнасцю з імі настаўніка, па-зашкольных работнікаў з вызначэннем адказнага за групу ў часе паходу.

Загадчык гарана КУЗНЯЦОВА.

# ПАСТАНОВА № 17

## Прэзідыума Менскага горсовета ад 3-XI—34 г.

## Аб увядзенні дзяжурных дворнікаў на цэнтральных вуліцах г. Менска.

У мэтах трымання ў належным парадку двароў, вуліц і тратуараў, прэзідыум Менскага гарадскога совета ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць усе ЖАКТы, дзяржаўныя, кааператыўныя, грамадзкія ўстановы, арганізацыі і прыватныя домаўладанні ўстанавіць дзяжурных дворнікаў штодзенна на час з 8 да 24-х гадзін па наступных вуліцах:

а) Совецкай—ад Чырвонаармейскай да Свердлоўскай;
б) Ленінскай—ад Пл. Волі да вул. К. Маркса;
в) К. Маркса—ад Чырвонаармейскай да Свердлоўскай;
г) Энгельса—ад Окцябрскай да вул. К. Маркса;
д) Комсамольскай—ад Інтэрнац. да вул. К. Маркса;
е) Інтэрнацыянальнай—ад Валадарскага да Окцябрскай;
ж) Вул. 11 ліпеня да Свердлоўскай;
з) Свердлоўскай—ад Совецкай да Універсітэцкай.

2. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскласці на РС міліцыю.

3. Пастанова гэта ўваходзіць у сілу праз 7 дзён з дня яе апублікавання.

Старшыня Менгорсовета ЖУКОВІЧ.
Сакратар Менгорсовета ІПАТАЎ.

Тэл. 24905 Дзяржаўны акадэмічны тэатр Оперы і Балета
Мастацкі кіраўнік—засл. артыст рэспублікі І. А. ПІТГАРЦ.
Сёння опера
КНЯЗЬ ІГАР
у 3 дзеях. муз. Барадзіна.
Пачатак роўна ў 8 гадзін веч.

ГУКАВЫ кінатэатр „Чырвоная Зорка"
Гукавы фільм Органчыка 2 новыя замежныя камедыі. Гастролі Отто Франкардзі

Кіно „Інтэрнацыянал"
НАТА ВАЧНАДЗЕ ў новым усходнім маст. фільме АПОШНІЯ КРЫЖАНОСЦЫ.

Гукавы кіно-тэатр „Пролетарый"
Новымаста кі фільм Зямля праграмы канцэрты УСХОДНЯГА АНСАМБЛЯ

Кіно „СПАРТАК"
Ігар Ільінскі ў камедыі Працэс аб трох мільёнах у 6 частках.

Н. К. Ц. П.
САЮЗВОДСТРОЙ
Аддзяленне Ўсесаюзнай буравой канторы „БУРВОД"
па БССР, Зах. вобл. і Украіне
трымае
СВІДРАВАННЕ КАЛОДЗЕЖАЎ
на ваду са сваім матэрыялам.
Звяртацца: Гомель, вул. Леніна, 18.
„БУРВОД".

Адміністрацыя, мясцком і калектыў супрацоўнікаў кіраўніцтва спраў Совета Народных Камісараў БССР выказваюць сваё глыбокае спачуванне консультанту кіраўніцтва спраў СНК т. ПЕВІНУ з прычыны заўчаснай смерці яго жанчыны

Раісы Абрамаўны ЛЕВІНАЙ

і сына Абрама.

Выпускаючы—КРУЧКОЎ, ст. карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж — Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпёр — КАГАН Е., ст. друкар — АНУЧЫН.
Менск, друкарня «Звязды». Уп. Галоўлітбела № К—3291.